PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

# Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

http://republika.pl/niva_bielastok/
niva_bielastok@poczta.onet.pl
niva_bielastok@skrzynka.pl

№ 43 (2424) Год XLVII Беласток, 27 кастрычніка 2002 г. Цана 2,00 зл.

## Скарыстаць козыры

**Размова са старшынёю Гайнаўскага аддзела Беларускага саюза ў РП Міхасём АНДРАСЮКОМ.**

*— Гайнаўскі аддзел Беларускага саюза ў РП актывізуе сваю дзейнасць — вось, хаця б памяшканне па вул. кс. І. Верабея, 18, у Гайнаўцы. Што новага хочаце запрапанаваць жыхарам Гайнаўшчыны?*

— Паколькі пачаўся новы навучальны год, стараемся крыху дапамагчы настаўнікам і вучням. Кожная школа на Гайнаўшчыне, дзе вядзецца навучанне беларускай мовы, атрымае ад нас невя-



Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

лікую дапамогу, відэакасеты і аўдыёкасеты з казкамі на беларускай мове. Хай маладыя навучэнцы паслухаюць як гучаць па-беларуску казкі „Аліса ў краіне цудаў” ці „Пакахонтас”. Ёсць просторнае памяшканне. У верасні яшчэ не бачылі тут натоўпу, але спадзяемся, што ў кастрычніку і лістападзе шмат хто сюды загляне. Наша сувязь са светам абмяжоўваецца, у галоўным, да тэлефонай (682 33 73). Змяшчаецца тут рэдакцыя „Гайнаўскай панарамы” і з кастрычніка будзем карыстацца Інтэрнэтам. Пасля выбараў, калі стануць вядомымі прозвішчы нашых самаўрадаўцаў, у нашым памяшканні пачне дзейнасць Беларускі самаўрадавы форум, які ўжо зарэгістраваны.

***— Ці можна спадзявацца, што ў гэтай групе самаўрадаўцаў будзе Міхась Андрасюк?***

— Пра гэта якраз вырашаць жыхары Гайнаўкі, бо фактычна прапаную сваю асобу як кандыдата на раднага Гайнаўскага павета.

***— Твая асоба атаясамліваецца з літаратурай і радыё, а не з працай у самаўрадзе.***

— Калі пра літаратуру, дык ад яе я зусім не адышоў. Працую над новай кніжкай прозы. Магу рассакрэціць яе загаловак — „Зубр”. Звычайная гісторыя. У малым мястэчку здараецца цуд, а менавіта паяўляецца зубр з залатымі рагамі. А затым і чарговы цуд. І узнікае пытанне, ці ў невялікай геаграфічнай

[працяг ☞ 2]




Фота МІРЫ ЛУКШЫ

Беларускі выбарчы камітэт апынуўся на чацвёртым месцы сярод семнаццаці

# Выбары ў „Нысцы”

У нядзелю 13 кастрычніка на сямейным фэсце, арганізаваным прафсаюзамі і „Кур’ерам паранным” паявілася менш людзей, чым прадугледжвалі арганізатары. Быў гэта другі ці трэці халодны дзень непадзяванага зыходу восені. Пад гукі жартаў і папулярнай музыкі, што далятала на Рынку Касцюшкі з эстрады застаўленай па баках агромністымі стэндамі кандыдата лявіцы (ОПЗЗ — састаўная частка СЛД) на прэзідэнта (дарэчы, дыска-пола, здаецца, гэта ўлюбёныя рытмы сяброў гэтай групоўкі) прахаджваліся нешматлікія беластачане, да якіх падмаўляліся прадстаўнікі розных камітэтаў. Быў такі момант, што лістоўкамі ды плакатамі абдароўвалі адзін аднаго рэпрэзентанты розных камітэтаў. Толькі тады, калі кандыдатка на дэпутата з 3 месца ў Падляшскі сеймік начапіла сабе на куртку рэкламу з Антонам Міpановічам, перасталі ёй прапанаваць лістоўкі іншых кандыдатаў. А вядомы дырэктар з СЛД, кандыдат таксама з 3 месца ў гарадскую раду, убачыўшы словы з лістоўкі „Люблю наш край, старонку гэту...”, даспяваў песню да канца і прызнаўся, што хоць ён сам паляк, дык жонка ў яго Тамара. Грэліся гарачым півам са спецыямі побач сябе кандыдаты ад СЛД, Самаўрадавай уніі і яшчэ 15 іншых камітэтаў. А ў старым фургоне „Ныса” можна было аддаць свой перадвыбарчы голас на свайго кандыдата (на талоне выразаным з „Кур’ера”), і за тое атрымаць кавалачак „выбарчай каўбаскі”. На працягу чатырох гадзін галасавала больш за 1 300 чалавек. Толькі дзіўным чынам на месцы, дзе дзейнічаў камітэт таго дзіўнага дзядзькі, які „выйграў” у перадгонках гарадскую „прэзідэнтуру”, ляжалі гурбы пашкуматаных экземпляраў газеты з выразаным ці выдзертым талонам.

Так і атрымалася — той малады неардынарны кандыдат (лозунг „Kochajmy się!”) сабраў 404 галасы, той, які здаваўся быць фаварытам, быў трэці, а наш, Антось — сёмы. Ці былі цуды над урнамі? — дапытваўся той закаханы кандыдат, які стаяў да канца „выбараў” і чакаў спадзяваных вынікаў. Другая была спадарыня Эва, адзіная жанчына ў капманіі дванаццаці кандыдатаў у прэзідэнты, кандыдатка заснаванай Уніяй вольнасці Беластоцкай самаўрадавай уніі; дарэчы, за яе ўлады горад развіваўся як адзін з лепшых у краіне.

На перадвыбарчы мітынг найбольш мабілізавалася кааліцыя СЛД-УП, якая привезла аграмадныя більборды з падрэтушаваным прафесарам, міністрыху і самога свайго падляшскага шэфа. Прафесар не хацеў выступаць на сцэне, затое сённяшні прэзідэнт, якога партрэтамі заклеены цэлы горад і другі, кандыдат Права і справядлівасці асабіста выступілі на парадзе арганізаваным апазіцыяй.

Беларускі выбарчы камітэт апынуўся на чацвёртым месцы сярод семнаццаці. Не давалі мы белых шалічкаў як „ярдаўскі” кандыдат. Сярод пажоўклых мокрых лістоў нашы лістоўкі не валяліся. Журналісты дапытваліся ў амаль кожнага, на каго галасуюць. „Oczywiście, na Białoruski Komitet” — „Dlaczego?” — „Bo jestem stamtąd!” А зараз і папраўлялася: Bo jestem stąd.

Міра ЛУКША

## Узмацняне мяжы ☞ 3

Аб’ект пагранзаставы ў Дубічах складаецца з цэнтральнага будынка, аддзеленага ад харчовага блёка, гаражнага будынка з шасцю боксамі і жыллёвага блёка з шасцю элегантнымі кватэрамі для афіцэрскага саставу. Цэласць забяспечана ўласнай кацельняй, фільтрамі для папраўы якасці вады, трансфарматарнай станцыяй і генератарам электратоку.

## Нягледзячы на вынік ☞ 4

Нягледзячы на вынік выбары ўжо можна лічыць перамогай з-за якасці арганізацыі і формы выбарчай кампаніі. Калі б так былі арганізаваны ўсе палітычныя акцыі ад 1989 г., цяпер праўдападобна было б сваё шырокае прадстаўніцтва ўва ўсіх структурах улады на Беласточчыне. Меншасць, якая атаясамліваецца толькі з адной партыяй, сама вызначае сабе месца на абочыне грамадскага жыцця.

## Калаўротак тэлерэдактаркі ☞ 5

Літаральна я аж збялеў, бы той дурань, пачуўшы каментар тэлевізійнай рэдактаркі: „Выбарчы калаўротак стаў круціцца. 11,5 тыс. падлясян адчулі Божую волю і рашылі стартаваць у самаўрадавых гонках. І выскачылі як Філіп з канапель пан Х і пані У, людзі без прозвішча, без вопыту, без ідэй”.

## Адкрыты праект ☞ 5

Увесь дзень са школьнага радыёвузла чуваць было беларускую музыку, а на сценах і падлозе расклеены былі плакаты „Бардаўскай восені 2002”. Тады ўжо ўсе даведаліся, што дзіўныя здарэнні папярэдніх дзён звязаны былі з фестывалем. У нашай школе склалася традыцыя, што тыдзень да мерапрыемства адбываецца своеасаблівая рэкламная кампанія.

## Місія ў Жацераве ☞ 9

У Жацераве ўсё зацерлася, — кажа Рэгіна Васілевіч, кіраўнік Дома культуры. Ніколі не чула пра сувязь Янкі Лучыны з іх вёскай. У народзе захавалася памяць пра ўрочышча „Двор”. І хаця Рэгіна Васілевіч мае поўныя рукі работы, сядае ў машыну і едзе паказаць нам „Двор”.

## Польска-беларускі сімпозіум уролагаў ☞ 11

На трохдзённым сімпозіуме ў Белавежы сустрэліся уролагі — навукоўцы і практыкі з Польшчы і Беларусі. Арганізатарам быў Беластоцкі аддзел Польскага таварыства уралогіі з яго старшынёй Барбарай Дарэвіч. Супрацоўнічае яна ад дзевяностых гадоў з найважнейшымі клінічнымі цэнтрамі уралогіі ў Мінску, Магілёве, Брэсце і Гродне.

## Беларусь — беларусы

# Скарыстаць козыры

[1 ☞ працяг]

і сацыяльнай прасторы хапае месца на такую колькасць цудаў? Спадзяюся, што кніжка з’явіцца ў 2003 годзе. А ці змагу сустрэцца са слухачамі „Рацыі” ў маіх суботніх канцэртах пажаданняў? Зараз сапраўды не ведаю. Пры нагодзе — прывітанне ўсім, хто суботнімі адвячоркамі набіраў 664 21 00. Трэба верыць, што гэтае ці другое беларускае радыё яшчэ прагучыць у эфіры. А што тычыцца самаўрадаў, то тут працы, хоць адбаўляй.

***— Якая гэта праца?***

— Праблемы, якія давядзецца вырашаць беларускім самаўрадаўцам, такія ж, што і ўва ўсіх апошніх: асвета, ахова здароўя, вуліцы, водаправоды. Прытым трэба нам памятаць аб праблемах, якія маюць дачыненне адно да беларускай меншасці. Значыць, захаванне культуры продкаў, пашырэнне навучання беларускай мовы ў школах. Праблемы Праваслаўнай царквы, гэта таксама нашы праблемы.

***— У Гайнаўцы доўга не можа завяршыцца будова Беларускага музея.***

— Фактычна, гэта праблема крышку дзіўная. Ва ўладах Камітэта пабудовы музея, а таксама ў гарадскіх, гмінных ды павятовых самаўрадах сустракаем тыя ж самыя прозвішчы. Калі будова музея не завершыцца на працягу бліжэйшых чатырох гадоў, будзе гэта пройгрыш усіх беларусаў. І няважна, ці свае самаўрадавыя функцыі выпаўняюць яны ад левых, правых ці Беларускага камітэта. У гэтай справе неабходная кансалідацыя ўсіх самаўрадаўцаў, усіх, якія лічаць сябе беларусамі або заяўляюць сябе прыхільнікамі беларусаў.

***— Зараз у Гайнаўцы і наваколлі вялікае беспрацоўе. Як можна вырашаць гэтае пытанне?***

— Калі які-небудзь кандыдат у самаўрады абяцае, што паспяхова і канчаткова вырашыць праблему беспрацоўя, тады або не ведае, што гаворыць, або свядома абмінае праўду. Ні бурмістр, ні староста, а ўжо ў ніякім выпадку звычайны радны не ў змозе ліквідаваць беспрацоўе ў сваім горадзе ці гміне. Абмежаваць беспрацоўе — такая магчымасць ёсць. Перш за ўсё — шукаючы інвестараў. Прыцягнуць іх можна рознымі інструментамі, напрыклад, лёгкімі падаткамі. У нашым выпадку сваё значэнне мае таксама і дзяржаўная мяжа, паколькі не стане яна сцяною, мурам. Адзін міжнародны пераход можа быць крыніцай прыбытку многім жыхарам павета.

***— Ёсць пераход у Полаўцах, але ён вялікага прыбытку не дае.***

— Не дае, бо гэта мініяцюра перахода. У Полаўцах мяжу перасякаюць толькі жыхары Польшчы і Беларусі на легкавушках. Вядома, перайменаваць пераход з міждзяржаўнага на міжнародны не зможа ні войт, ні староста. Ёсць жа ў нас і міністры, якія лічаць сябе вялікімі сябрамі беларусаў. Тады трэба стукаць нам у гэтыя міністэрскія дзверы часта.

***— Гледзячы на гаспадарчыя цяжкасці Гайнаўкі, гаворыцца, што наша будучыня ў турызме звязаным з Белавежскай пушчай.***

— Будучыня так, але я б сказаў — будучыня нашых дзяцей ці яшчэ наступных пакаленняў. Натоўп турыстаў не паяўляецца раптоўна. Усё ж ужо зараз трэба рыхтаваць фундамент, на якім цягам дзесяці, можа дваццаці, гадоў узвядзецца вялікі турыстычны дом „Белавежская пушча”, не горшы за славутае Закапанэ. І скарыстаць тут трэба ўсе козыры. Тыя, якія дала нам прырода і тыя, якія дайшлі да нас — гістарычную спадчыну. Гаварыць пра культурную, канфесійную і нацыянальную разнароднасць адно, а ажыццяўляць гэты козыр — зусім другое. Неяк не здарылася мне пачуць беларускага самаўрадавага чыноўніка, які вітаючы варшаўскую, нямецкую ці дацкую дэлегацыю адазваўся б на матчынай мове. А вось так сабе, хаця б для жарту.

***— Пакуль узвядзецца дом „Белавежская пушча” можа аказацца, што адзін з козыраў — нацыянальная разнароднаць — цалкам выцясніцца. Беларусы асімілююцца.***

— Праўда, спадзявацца, што нашу беларускую спадчыну захаваюць жыхары вёскі — дарма. Яны ж не вечныя. Захаваць сябе як беларуса жыхару горада, напэўна, складаная справа. Кажуць, рыба псуецца з галавы, але гавораць таксама, што добры прыклад ідзе зверху. Зверху — разумею я — ад нашых бурмістраў, войтаў, старастаў і радных. Вось і прычына, для якой у Бельску, Гайнаўцы і Беластоку створаны беларускія выбарчыя камітэты.

***— Дзякую за размову.***

Гутарыў Аляксей Мароз

# Цяжарнасць на парламентарызм

Ужо добрых паўдзесятка гадоў беларускі парламентарызм перажывае, мякка кажучы, далёка не лепшыя часы. Але калі разважаць, зыходзячы з высновы, што ўсё цячэ — усё змяняецца, то некаторыя апошнія падзеі вакол галоўнага заканадаўчага органа краіны — Палаты прадстаўнікоў — даюць хоць слабую, але надзею на лепшае.

Прыгадаю гісторыю. Пасля сумнявядомага рэферэндуму 1996 г. абраны народам Вярхоўны Савет быў разагнаны. На яго месца, у абыход канстытуцыйных палажэнняў, была сфармавана Палата прадстаўнікоў 1-га склікання. Менавіта сфармавана, а не абрана. Бо ў яе склад увайшлі толькі тыя дэпутаты Вярхоўнага Савета, якія пагадзіліся з антыканстытуцыйнымі дзеяннямі выканаўчай улады і тым самым засведчылі сваю лаяльнасць перад прэзідэнтам Лукашэнкам. Такіх мусіла быць 110 чалавек. Зразумела, што гэта значна менш амаль 360, з якіх складаўся ранейшы беларускі парламент. Адпаведна, што пагадзіцца з такім таптаннем права мець свайго прадстаўніка ад шматлікіх акруг здолелі не ўсе і такія чыннікі дагэтуль не даюць магчымасці наладжванню нармальнага супрацоўніцтва Палаты не толькі з парламентамі краін-суседзяў, але і паважнага стаўлення да яе з боку ўласнага народа. Сапраўды, дэпутаты новага „парламента” добра ведалі дзякуючы чаму і каму яны займаюць свае пасады. І воля народа ў іх колішнім абранні адыходзіла далёка на задні план.

Але час мінае і „ничто не вечно под Луной”. Паўнамоцтвы Вярхоўнага Савета, які не здолеў стаць цэнтрам апазіцыі, скончыліся. Яго нават перасталі прызнаваць заходнія дэмакратыі і міжнародныя арганізацыі, а да прызнання за сапраўдны парламент Палаты прадстаўнікоў здолела хіба толькі расійская Дзярждума, зразумела, зыходзячы выключна з інтарэсаў сваёй краіны, а не абароны дэмакратычных каштоўнасцей у Беларусі.

Разам з тым, у 2000 годзе скончыліся ўрэшце паўнамоцтвы прызначанага „парламента”. Хочаш-не хочаш, а новы склад Палаты, згодна Канстытуцыі, мусіць быць абраны. Што, зразумела, і адбылося. Праўда, выбары праходзілі з вялізарнай колькасцю парушэнняў і неймавернага выкарыстання выканаўчай уладай адміністрацыйнага рэсурса, але новыя дэпутаты сталі адрозніваецца ад папярэдніх „членаў парламента”. Выбарнасць для некаторых з іх стала падставай для праяў нейкага вальнадумства і нават сціплай апазіцыйнасці. Канешне ж, такіх дэпутатаў зараз не можа быць многа. На даны момант іх можна пералічыць па пальцах адной рукі, але ўжо з вуснаў некаторых чутны словы аб вартасці стварэння адмысловай групы па справах зніклых палітыкаў, супрацоўніцтве з апазіцыйнымі арганізацыямі і так далей.

Адным з найбольш яскравых „палаткаў-апазіцыянераў” стаў генерал Валерый Фралоў з Гродна. Зразумела, яго апазіцыйнасць нельга нават у нечым параўноўваць з апазіцыйнасцю Зянона Пазьняка, але магчымы факт з’яўлення новай і, па ўсёй верагоднасці, самастойнай палітычнай фігуры на беларускім палітычным небасхіле выклікае станоўчыя рэакцыі.

Калі крыху прааналізаваць наколькі вялікія магчымасці палатных апазіцыянераў у паляпшэнні сацыяльна-эканамічнай і палітычнай сітуацыі ў Беларусі, то вочы, вобразна кажучы, пакрываюцца слязамі. Нават, калі абстрактна ўявіць, што тым тром-чатыром дэпутатам удалося пераканаць у чымсьці антыпрэзідэнцкім большасць сваіх калег, то цалкам верагодна, што пад пагрозай апынецца ўвесь склад Палаты, бо адпаведна Канстытуцыі паўнамоцтвы парламента могуць быць спынены на падставе грубага парушэння гэтай самай Канстытуцыі. Зразумела, такое можа адбыцца толькі на падставе заключэння Канстытуцыйнага суда, але ж большая яго частка разам са старшынёй прызначаецца... прэзідэнтам.

Усе фінансавыя выдаткі Палаты ідуць выключна праз Адміністрацыю прэзідэнта, бо сваёй бухгалтэрыі беларускі „парламент” не мае. І тут узгадваецца прымаўка — хто плаціць, той і заказвае музыку. Таму вялікіх праяў вальнадумства і адстойвання сваіх прынцыпаў перад прэзідэнцкай уладай наўрад ці варта чакаць ад новых „апазіцыянераў”. Пра гэта, дарэчы, сведчыць і нядаўняя адмова стварыць адмысловую парламенцкую камісію па расследванню справы зніклых палітыкаў. „Парламент” асмеліўся толькі да накіравання запыту аб іх лёсе генеральнаму пракурору.

Разам з тым, мільганула надзея на лепшае. На тое, што ў дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў ёсць шанцы стаць у будучым сапраўднымі парламентарыямі, ускосным сведчаннем чаго з’явіліся нядаўнія словы самога А. Лукашэнкі аб шкодзе магчымага пашырэння функцый Палаты. Бо як вядома, мёртвага сабаку ніхто не б’е.

Уладзімір Лапцэвіч

# Дарафей Фіёнік — стыпендыст

Праўленне Падляшскага ваяводства прызначыла гадавыя стыпендыі на 2003 г. у галіне мастацкай творчасці, распаўсюджвання і аховы культурных каштоўнасцей. У ліку стыпендыстаў апынуўся гісторык і краязнавец Дарафей Фіёнік з Бельска-Падляшскага. У яго творчых планах — падрыхтаванне архіўных матэрыялаў для штоквартальніка „Бельскі Гостінэць” аб мінулым вёсак Крывая, Шчыты і наваколля; наладжанне этнаграфічных выставак „Мяшчанскія пісанкі — велікодная творчасць горада Бельска і мяшчанскіх вёсак” ды „Студзіводскі асяродак валення”; курсы традыцыйнага ткацтва і вышыўкі для дзяцей і моладзі ў час канікулаў.

www.sejmik.bialystok.pl

Раднаму **Васілю ІВАНЮКУ** і яго сям’і шчырыя спачуванні з прычыны напаткаўшага яго гора — **смерці жонкі Раісы** — выказваюць сябры Беларуска-народнага выбарчага камітэта.

# Праграма супрацоўніцтва з Усходам

Урадавая праграма супрацоўніцтва Польшчы з краінамі СНД прадугледжвае магчымасць прадастаўлення Беларусі польскіх крэдытаў на закупку польскіх тавараў. Аб гэтым 15 кастрычніка г.г. паведаміў у Мінску віцэ-міністр гаспадаркі Польшчы Анджэй Шараварскі. Аб крэдытах могуць хадайнічаць таксама іншыя краіны СНД. Польскі ўрад прапануе таксама багатую аферту камерцыйных крэдытаў для польскіх прадпрымальнікаў, якія намерваюцца дзейнічаць на ўсходніх рынках.

У праграме супрацоўніцтва прадугледжана актыўная інфармацыйная кампанія на Усходзе — кірмашы, выставы і семінары з удзелам польскіх фірмаў, мэтай якіх будзе паказанне іх магчымасцей экспарту і супрацоўніцтва.

Паводле спецыялістаў, гаспадарчае супрацоўніцтва Польшчы і Беларусі недастаткове. Да гэтай пары не ўдалося дасягнуць гандлёвых абаротаў 1997 г. (да фінансавага крызісу ў Расіі). У 2001 г. абароты гэтыя склалі нямнога больш за 400 млн. долараў. У Беларусі дзейнічае больш за 500 польскіх фірм або прадпрыемстваў з польскім капіталам. Паводле віцэ-міністра Шараварскага, гэта вынік малой прысутнасці Польшчы на рынках краін СНД (толькі 9% замежнага тавараабмену прыпадае на гэтыя краіны).

Сітуацыя можа ўскладніцца пасля ўваходу Польшчы ў Еўрапейскі Саюз. Віцэ-міністр замежных спраў Беларусі Аляксандр Міхневіч заўважыў, што тады з’явяцца некарысныя абмежаванні ў экспарце некаторых беларускіх тавараў. Перашкодай будзе таксама ўвядзенне ў ліпені 2003 г. віз для грамадзян Рэспублікі Беларусь.

Паводле ПАП



Фота МАЦЕЯ ХАЛАДОЎСКАГА

*Дубіцкая пагранзастава асвячана прадстаўнікамі аднаго Бога*



Фота МАЦЕЯ ХАЛАДОЎСКАГА

*Генерал, віцэ-міністр і ваявода адчыняюць браму Еўрасаюза*

# Узмацнянне мяжы (у Дубічах)

Пакуль дзесяць службовых асоб, а ў будучыні трыццаць адна будуць служыць у сучасна абсталяванай пагранічнай заставе ў Дубічах-Царкоўных. Будуць яны ахоўваць 16 кіламетраў мяжы.

На адкрыццё пагранзаставы 11 кастрычніка ў Дубічы з'ехаліся тлумы гасцей. Сярод іх быў Тадэвуш Матусяк, віцэ-міністр унутраных спраў і адміністрацыі, пасол Анджэй Брахманскі, старшыня сеймавай камісіі ўнутраных спраў (дэпутаты ад Падляшша ў той час былі ў Сейме), генерал Юзаф Клімовіч, шэф Галоўнай камендатуры Падляшскай часці Памежнай службы, падляшскі ваявода Марэк Стшалінскі і віцэ-ваявода Ежы Паўяновіч, сенатар Сяргей Плева і генералы беларускіх і літоўскіх памежных службаў. Пасвяцілі аб'ект супольна каталіцкі капелан Польскага войска і епіскап генерал Міран, праваслаўны ардынарый ПВ.

Аб'ект пагранзаставы ў Дубічах складаецца з цэнтральнага будынка, аддзеленага ад харчовага блёка, гаражнага будынка з шасцю боксамі і жыллёвага блёка з шасцю элегантнымі кватэрамі для афіцэрскага саставу. Цэласць забяспечана ўласнай кацельняй, фільтрамі для паправы якасці вады, трансфарматарнай станцыяй і генератарам электратоку. Пагранзастава абсталявана сістэмамі радыёсувязі і інфарматычнай. Інфарматычная сістэма забяспечвае Памежную службу ў доступ да баз даных, дапаможных у ахове мяжы, у тым ліку да краёвай паліцыйнай сістэмы. Не здзіўляе затым, што пры новапабудаваных будынках пастаўлена 35-метровая радыёмачта, якая ўзвышаецца над ваколіцай. Службоўцы з Дубіч карыстаюцца матацыкламі Хонда і КТМ, Ландроверамі і КТХамі.

— Гэта вельмі добра, што тут адкрылі пагранзаставу, — сказала „Ніве" ў час урачыстасці адна з жыхарак Дубіч, якая назірала за яе ходам з іншымі сялянамі. — Парадак будзе, і людзі будуць мець працу. Тут жа ж служаць і хлопцы з нашай ваколіцы.

Віцэ-міністр Матусяк прывітаў пагранічнікаў ад імя прэм'ера Лешка Мілера:

— Гэта адзін з самых прыгожых аб'ектаў Памежнай службы. Будзе ён добра служыць Польшчы і з'яднанай Еўропе.

Ваявода Марэк Стшалінскі меў надзею:

— Ад пагранічнікаў чакаем, каб праз мяжу польскай дзяржавы, будучую мяжу Еўрасаюза, не маглі нелегальна прабірацца людзі, кантрабанда і небяспечныя матэрыялы. Але чакаем таксама, каб былі вы прыязнымі і аблягчалі памежны рух прадпрымальнікам, турыстам, тым усім, хто легальна яе перасякае.

— Праграма ўшчыльнення мяжы прадугледжвае ўзмацненне саставу і мадэрнізацыю абсталявання нашай часці, пабудову і разбудову сучаснай сеткі сувязі і інфарматыкі, увядзенне сучаснага інфарматычнага абсталявання, — у сваю чаргу прамаўляў ген. Юзаф Клімовіч. — Спраўная структура, падрыхтаваны афіцэрскі састаў і сучаснае абсталяванне гэта неабходныя ўмовы рэалізацыі нашых заданняў, акрэсленых ва ўрадавым плане „Бяспечная Польшча" і вынікаючых з працэсаў інтэграцыі з Еўрасаюзам.

Адна з галоўных праблем, якія пастаўлены перад службоўцамі новаадкрытай пагранзаставы — затрымванне нелегальных імігрантаў, найчасцей, як гэта бывае на ўсходніх адрэзках мяжы — уцекачоў з Ірака, Шры-Ланкі, Курдыстана і з краін СНД.

Перад самым пасвячэннем аб'екта епіскап Міран перадаў камендакту Падляшскай часці Памежнай службы ікону святога Міхаіла, „каб сцярог ад няпрошаных гасцей".

Пагранзастава ў Дубічах — 16 адкрытая на адрэзку ахоўваным Падляшскай часцю ПС. Наступную адкрылі 19 кастрычніка ў Міхалове, а ў наступным годзе будзе адкрыта пагранзастава ў Шудзялаве.

— Усё залежыць ад забеспячэння ў грошы з цэнтральнага бюджэту, — паведаміла прэс-інфарматар ПЧ ПС паручнік Анна Валошын-Врона.

У 2003-2006 гадах у прызыўную службу ў ПС мае трапіць 5 300 новых пагранічнікаў. Папаўненне памежнай стражы ў Дубічах мае наступіць у будучым годзе. У найбліжэйшы час у рамках дапамогі Еўрасаюза польская Памежная служба мае атрымаць аўтаматычныя і самазарадныя пісталеты, сучаснае тэрмавізійнае падручнае абсталяванне (біноклі) і на аўтаматычнай базе, а таксама сучаснае электроннае абсталяванне. Да наступнай вясны ўсе польскія пагранзаставы будуць мець пастаянную, непасрэдную сувязь з „цэнтраляй".

На думку галоўнага каменданта ПС найлепшае памежнае супрацоўніцтва на ўсходнім адрэзку — з літоўскімі і беларускімі службамі (з гэтым згодны былі прысутныя на ўрачыстасці ў Дубічах генералы з Беларусі і Літвы).

— Ёсць у нас сур'ёзныя праблемы ў супрацоўніцтве з украінцамі. Іхныя службы не заўсёды дастасоўваюцца да рэадмісійнага дагавора (перадаванне і прыманне без лішніх фармальнасцей чужаземцаў пасля нелегальнага пераходу мяжы), — дадаў генерал Клімовіч.

Азяблых гасцей пасля агляду пагранзаставы пагранічнікі пачаставалі смачным гарохавым супам. Затым, за шведскім сталом у мясцовай школе, падымалі тосты шампанскім. Пасол Брахманскі заклікаў:

— Нельга забываць, што памежная страж функцыянуе сярод мясцовай грамадскасці і мусіць з ёю сужыць, разумець яе праблемы і супрацоўнічаць.

Мацей Халадоўскі

# Настаўніцкае свята ў белліцэі

Святкаванне „Дня нацыянальнай адукацыі" ў Комплексе школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Гайнаўцы распачалося раніцай 11 кастрычніка. Вучні хадзілі па школе з кветкамі, падарункамі і на пачатку ўрокаў спявалі „Многае лета" або „Sto lat". Кветкі ўручалі не толькі настаўнікам, але і астатняму персаналу школы.

— Любім нашых настаўнікаў, бо яны гуманныя, разумеюць нашы праблемы і ўмеюць выбачаць, — заявіла белліцэістка. — Але добра было б, каб давалі нам менш хатняй працы.

Настаўнікі выказвалі задавальненне з лепшых чым раней умоў працы і павышанай зарплаты.

На пятым уроку настаўнікі спаткаліся з гімназістамі, а на шостым з ліцэістамі. Вучні падрыхтавалі сваім педагогам прадстаўленні, спявалі песні. Намеснік дырэктара Аляксандр Лаўрыновіч павіншаваў усіх працаўнікоў школы і ўручыў узнагароджаным настаўнікам дыпломы. Медаль Камісіі нацыянальнай адукацыі атрымала Вольга Сянкевіч, а Ян Карчэўскі і Галена Ёнаш — Крыж заслугі III ступені. Узнагароджаны таксама Аліна Пліс, Ніна Лукасік, Гражына Мішчук і Славамір Чыквін.

Аляксей Мароз



Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

*Настаўнікі Гайнаўскага белліцэя (справа): Ян Карчэўскі, Вольга Сянкевіч, Яўген Янчук і Ева Васілюк*



Фота Мацея Халадоўскага

*Ян Новак-Езяранскі (справа) і Антон Мірановіч*

# Беларуская місія кур'ера

Я хацеў бы, каб беларусы ў Польшчы адчувалі, што ў іх аднолькавыя шанцы, як у палякаў, у тым каб рабіць кар'еру, каб ідэнтыфікаваліся з гэтай дзяржавай, з уласнай мовай, культурай і традыцыяй, — сказаў у Беластоку Ян Новак-Езяранскі, былы шматгадовы дырэктар польскай секцыі Радыё Вольная Еўропа, слынны кур'ер Арміі Краёвай у Лондан.

Прыехаў ён па запрашэнні беластоцкіх прадпрымальнікаў. З уласнае волі хацеў сустрэцца з беларускім асяроддзем.

— Я вельмі шчаслівы, што мы маглі сустрэцца, і гэта з майго боку не канвенцыянальная фраза. Галоўная мэта майго візіту ў Беласток гэта спатканне з вамі. Прымірэнне і набліжэнне паміж намі — у жыццёвым інтарэсе Польшчы, — пачаў сустрэчу з лідэрамі беларускіх арганізацый, моладдзю і журналістамі.

Блізка 90-гадовы Ян Новак-Езяранскі (58 гадоў у эміграцыі; сёлета вярнуўся на пастаяннае жыхарства ў Польшчу) прызнаўся, што мала ведае аб праблемах польскіх беларусаў:

— Ці ёсць у вас нейкі памост, федэрацыя арганізацый на ўзор Кангрэса амерыканскай Палёніі, без дамінацыі якойсьці з іх? — пытаўся.

Выказаў перакананне:

— Канфлікт, нянавісць, дыскрымінацыя як бумеранг удараюць у таго, хто іх кідае. Чым больш лібералізм у адносінах да меншасцей, тым лепш для Польшчы. Усе нацыі маюць тую схільнасць, што памятаюць аб крыўдах, якія ім былі нанесены, а не аб сваіх, учыненых самімі. Крыніца антаганізмаў — перш за ўсё мінулае. У нашых адносінах на такіх антаганізмах заўсёды карыстала Масква. Ці варта сварыцца, хто каго больш пакрыўдзіў?

Прапанаваў, каб на ўзор апрацаванай кнігі польска-беларускіх разыходжанняў у супольнай гісторыі падрыхтаваць па пунктах „спісак неафармленых спраў". Мае яна паслужыць Новаку-Езяранскаму для размоў з яго высокапастаўленымі сябрамі. Дадаў прытым, спасылаючыся на намечаныя Яўгенам Вапам, старшынёй Беларускага саюза ў РП, праблемы з установай у Бельску помніка памяці забітых атрадам „Бурага" фурманоў.

— Палякі павінны як найдалей ісці поплеч з беларусамі ў справе ўвекавечання месцаў іх памяці. Беларусы, як і палякі, маюць поўнае права для ўвекавечання сваіх герояў.

Ян Новак-Езяранскі падтрымаў ідэю стварыць свайго роду Радыё Вольная Еўропа для беларусаў. На яго думку, магло б яно вяшчаць па-беларуску, і, можа быць, па-руску (каб дайсці да шырэйшай групы адрасатаў), каб і ў гэтай мове памагаць у развіцці беларускай свядомасці:

— Такое радыё павінна таксама перадаваць урокі беларускай мовы.

Са смуткам аднёсся да заблакіравання дзейнасці Радыё „Рацыя" (здаецца, не разумеў прычын, значыць, змены палітыкі Вашынгтона ў адносінах да Мінска і Масквы) і ліквідацыі з эфіру польскага публічнага радыё Багумілы Бэрдыхоўскай, знаўцы беларускіх рэалій і праблематыкі:

— Польскія ўлады павінны памагчы ў працы Радыё „Рацыя".

Новака-Езяранскага здзівіла, што ў час двухздзённай пабыўкі ў Беластоку і на Падляшшы не заўважыў кірылічных надпісаў, асабліва на прыватных крамах, як гэта ёсць у польскім раёне, напрыклад, у Чыкага.

Антон Мірановіч, кандыдат Беларускага выбарчага камітэта на прэзідэнта Беластока тлумачыў сітуацыю беларусаў у рэгіёне і яго сталіцы:

— Што з таго, што ў нас ёсць афіцыйныя прызнаныя правы і свабоды, калі ў лакальным маштабе яны не шануюцца.

Адносна палітыкі прэзідэнта Беларусі і сітуацыі ў гэтай краіне Ян Новак-Езяранскі сцвердзіў:

— У Польшчы ёсць шанц памагаць Беларусі і ўзмацняць яе дзяржаўнасць. Я хацеў бы ад вас даведацца, як да гэтага пытання падысці.

І зазначыў:

— У Польшчы няма магчымасці ваяваць з Аляксандрам Лукашэнкам. Нельга ў адзін „гаршчок" укідаць Лукашэнку і беларускае грамадства. Няма лепшага спосабу на кансалідацыю грамадства з кіраўніком, чым яго ізаляцыя. Польшча не павінна ўключацца ў крыжовы паход, хоць Лукашэнка гэта не дэмакрат.

Ужо дзень да сустрэчы з прадстаўнікамі беларускага асяроддзя, у час размовы з уладамі Беластока Ян Новак-Езяранскі выказаўся ў падтрымку самастойнага старту беларусаў у самаўрадавых выбарах (Беларускага выбарчага камітэта).

Мацей Халадоўскі

# Не так ружова, як здавалася б

Сусветны дзень турызму, якому папярэднічала навуковая канферэнцыя „Экатурызм дарогай да ўраўнаважанага развіцця", што праходзіла з 2 па 4 кастрычніка, невыпадкова святкаваўся ў Белавежы з удзелам цэнтральных улад. Апошнім часам адкрыты былі ў гэтай мясцовасці тры новыя гатэлі „Белавежскі", „Зуброўка", „Сапліцова" і некалькі новых агратурыстычных кватэр.

У Белавежы мноства рэклам, якія запрашаюць турыстаў на начлегі, харчаванне і адпачынак. Здавалася б, прыйшоў добры час для Белавежы і навакольных мясцовасцей. Аднак войт Станіслаў Куявяк заявіў, што падаткі ад новых гатэляў будуць выкарыстаны на сплату даўгоў, якія Белавежская гміна ўзяла на будову каналізацыі і дарог. Некалькі новых гатэляў не вырашылі справы беспрацоўя, бо на працу ў іх прымаліся, у галоўным, маладыя дзяўчаты з розных мясцовасцей Беласточчыны. Надалей у Белавежы і наваколлі шмат асоб шукае працу. З-за недахопу сродкаў спыніўся рамонт гатэля „Іва" і рэстарана побач яго. У Белавежскім нацыянальным парку няма сродкаў на выкананне ў музеі пастаяннай экспазіцыі. Войт Станіслаў Куявяк смуткуе, што прыблізна на 100-120 тысяч злотых паменшае бюджэт гміны, калі ўвойдзе ў жыццё пастанова аб стварэнні на тэрыторыі Белавежскай пушчы запаведнікаў з павышанай аховай, размерам каля 10 тысяч гектараў. Запаведнікі гэтыя будуць распаложаны, у галоўным, на тэрыторыі Гайнаўскай гміны, радныя якой выступілі ўжо з пратэстам да цэнтральных улад, і ў Белавежскай гміне.

Прысутная ў час святкаванняў намеснік міністра аховы асяроддзя, галоўны захавальнік прыроды, прафесар Эва Сыманідэс выказалася супраць развіцця ў Белавежскай пушчы масавага турызму, які мог бы знішчыць прыроду, але даў бы больш прыбытак мясцовым жыхарам. Заявіла яна, што ў парках самай лепшай формулай будзе экатурызм, які з'яўляецца дарогай да ўраўнаважанага развіцця рэгіёнаў і выказалася супраць будавання гатэляў на тэрыторыях, дзе ахоўваецца прырода. Адказваючы на пытанне журналіста наконт адмоўнага стаўлення мясцовых жыхароў да праекта пашырэння тэрыторый запаведнікаў у Белавежскай пушчы, прафесар Эва Сыманідэс заявіла:

— Мне вельмі прыкра, але для пашырэння запаведнікаў не трэба згоды мясцовай грамадскасці. Пашырэнне парку — гэта толькі справа часу і людзі самі захочуць яго.

Старшыня Польскай турыстычнай арганізацыі Анджэй Казлоўскі заявіў, што Міністэрства асяроддзя павінна публікаваць больш матэрыялаў, якія знаёмілі б турыстаў з месцамі павышанай аховы прыроды. Каля паркаў павінны быць пабудаваны аўтастаянкі, а на іх тэрыторыях выдзелены санітарныя месцы. Дырэктар Дэпартамента турызму ў Міністэрстве гаспадаркі Малгажата Міка-Брыска заявіла, што сёлета прадбачваецца паніжэнне на 15% даходаў ад замежных турыстаў. Даходы з турызму ў цэлым застануцца на мінулагоднім узроўні 33,5 мільярда злотых, што састаўляе каля 7% нацыянальнага валавога прадукту брута. Аднак, даходы з экатурызму пакуль вельмі малыя, размерам каля 4% ад усіх даходаў з турызму.

У час канферэнцыі згодна лозунгу „Экатурызм дарогай да ўраўнаважанага развіцця" многа дакладаў тычылася развіцця турызму на тэрыторыях, дзе ахоўваецца прырода. Удзельнікі сустрэчы хадзілі і ездзілі на экскурсіі па Белавежскай пушчы і глядзелі прыродазнаўчыя фільмы. Канферэнцыю завяршыла ўручэнне ўзнагарод Міністэрства гаспадаркі людзям, якія заслужыліся ў развіцці турызму.

Аляксей Мароз

# Нягледзячы на вынік

Сёлетнія самаўрадавыя выбары паказваюць, што беларускае асяроддзе здольнае на вельмі канструктыўную працу. Паспяхова быў створаны Беларускі выбарчы камітэт у Беластоку, які апрача кандыдатаў у гарадскую раду Беластока, паставіў таксама поўныя спіскі кандыдатаў у ваяводскі сеймік. У Гайнаўцы і Бельску-Падляшскім беларускія камітэты запрапанавалі выбаршчыкам сваіх кандыдатаў у гарадскія і павятовыя рады. Звыш сотні чалавек непасрэдна заангажавалася ў самаўрадавыя выбары пад беларускім шыльдам.

Раней чытаючы спіскі кандыдатаў ад беларускіх камітэтаў можна было здзіўляцца чаго той ці іншы дзядзька хоча шукаць у парламенце ці самаўрадзе. У гэтым годзе дамінуюць прадпрымальнікі, навукоўцы і настаўнікі. Інтэлектуальны ўзровень кандыдатаў ад беларускіх камітэтаў проста імпануе.

Трэцяй станоўчай прыкметай беларускай прысутнасці на гэтых выбарах — развражная і спакойная выбарчая кампанія, нягледзячы на правакацыйныя дзеянні некаторых канкурэнтных камітэтаў. Добра, што ніхто не палемізаваў з прадстаўнікамі СЛД ці Беластоцка-Гданьскай праваслаўнай епархіі, атакуючымі Беларускі выбарчы камітэт. Сур'ёзнай дыскусіі, як паказвае практыка мінулых гадоў, і быць не магло, паколькі сярод выбаршчыкаў заўсёды складвалася ўражанне прымітыўнай сваркі.

Нягледзячы на вынік, выбары ўжо можна лічыць перамогай з-за якасці арганізацыі і формы выбарчай кампаніі. Калі б так былі арганізаваны ўсе палітычныя акцыі ад 1989 г., цяпер праўдападобна было б сваё шырокае прадстаўніцтва ўва ўсіх структурах улады і зусім іншая была б атмасфера на Беласточчыне. Меншасць, якая атаясамліваецца толькі з адной партыяй, сама вызначае сабе месца на абочыне грамадскага жыцця. Таму памылковым быў удзел беларускіх дзеячаў у Форуме нацыянальных меншасцей, які меў служыць выключна інтарэсам СЛД. Варта прыгадаць, што з Форуму прынялі на спіскі гэтай партыі пару дадаваных таварышаў і пару праваслаўных дзеячаў. Спосаб, у які былі патрактаваны беларускія ўдзельнікі Форуму паказвае, што ад пачатку не было для іх там месца. Але традыцыйна трэба было ўсадзіць руку ў распаленую печку, каб пераканацца, што агонь можа прыпячы цела.

Вялікай асаблівасцю сёлетніх выбараў з'яўляецца прысутнасць палякаў на спісках Беларускага выбарчага камітэта. Да гэтай пары толькі беларусы выступалі на спісках польскіх партый. Беларускасць ужо перастала палохаць палякаў, як гэта бывала яшчэ дзесяць гадоў таму. Палохае яна выключна саміх беларусаў.

Яўген Мірановіч

# Адкрыты праект

**Месца падзей:** Комплекс школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Гайнаўцы.

**Час падзей:** 9 кастрычніка. Серада. 10 дзён да „Бардаўскай восені".

**Падзеі:** Вучні як заўсёды прыходзяць у школу ў восем гадзін. На калідорах сустракаюць вялікія і меншыя чорныя драўляныя рамы, а ў іх — брук. Адзін з камянёў памаляваны на чырвона. Ніхто не ведае, чаму так. Над брукаванымі квадратамі збіраюцца групкі ліцэістаў і дыскутуюць: „Што гэта?" — „Чырвоны — пэўна, сімвал крыві". „А можа гэта яўрэйскія могілкі..." — „Не жартуй!"

Камяні выклікаюць эмоцыі і рэакцыю. Нейкі жартаўнік на адным з квадратаў піша: „Убікацыя хвілёво пшэнесёна". Іншы „сур'ёзнік": „Можна мець шмат ідэй, аднак не кожная ёсць добрая". Пасля першага здзіўлення вучні пачынаюць больш адважна абыходзіцца з камянямі — не баяцца ўжо хадзіць па іх і пачынаюць лічыць іх амаль нармальным (мо крыху менш плоскім) кавалкам падлогі.

**Час падзей:** 10 кастрычніка. Чацвер. 9 дзён да „Бардаўскай восені".

**Падзеі:** Вучні спыняюцца на парозе залы 105 (кабінет беларускай мовы) і пытаюць здзіўленыя: „Дзе будуць урокі?" — „Тут, тут, уваходзьце, калі ласка". „Тут?!" Іх недаверлівасць выклікана тым, што бачаць у зале. А ў ёй усе сталы рассунутыя на бакі, крэслы ўстаўленыя кругам, а пасярэдзіне — гурба камянёў-валуноў!

Урокі ў зале 105 не адбываліся зусім звычайна. Гімназісты размаўлялі аб надыходзе восені і яе прыкметах, першакласнікі-ліцэісты мелі ўрокі прысвечаныя беларускай культуры. Яны чыталі вершы, маглі набыць зборнікі паэзіі і прозы Міры Лукшы (дарэчы, Міра Лукша 4 кастрычніка адведала наш ліцэй і правяла ўрокі ў некаторых класах, за што яшчэ раз дзякуем). Першакласнікі слухалі таксама беларускія песні. Нават адну мы вывучылі і пачалі разам спяваць — „Як забава, то да рання"...

**Час падзей:** 11 кастрычніка. Пятніца. 8 дзён да „Бардаўскай восені".

**Падзеі:** Увесь дзень са школьнага радыёвузла чуваць было беларускую музыку, а на сценах і падлозе расклеены былі плакаты „Бардаўскай восені 2002". Тады ўжо ўсе, нават тыя, якія не паспелі дапытацца, даведаліся, што ўсе дзіўныя здарэнні папярэдніх дзён звязаны былі з „Бардаўскай восенню". У нашай школе гэта ўжо амаль традыцыя, што тыдзень да „Бардаўскай восені" адбываецца своеасаблівая рэкламная кампанія. Галоўным спецыялістам па той рэкламе з'яўляецца Хрыстафор Ангельчык, сябра Звяза беларускай моладзі, які ад дзевяці гадоў арганізуе фестываль.

Сёлета Хрыстафор заявіў: „Мая мэта — не толькі заахвоціць моладзь да выезду на „Бардаўскую восень". З гэтым няма праблемаў — у мінулым годзе з гайнаўскага белліцэя прыехала пад сотню чалавек. Цяпер хочам сарганізаваць амаль асобнае мерапрыемства — „Адкрыты праект беларускіх ліцэяў", мэтай якога было б стварыць у школе незвычайную восеньскую атмасферу, а таксама заахвоціць маладых да задумы. Гэта важнае, а ў штодзённым, паспешлівым жыцці звычайна не атрымліваецца. Намерваюся таксама паказаць гісторыю Фестывалю „Бардаўская восень". У гэтым годзе пакарыстаўся я ідэй з плаката „Бардаўскай восені '98", які мне асабіста найбольш падабаецца — адтуль і брук на калідорах".

Акцыя накіравана да вучняў. А як яны да яе ставяцца? „Дэнэрвуе мне". — „Глупе. Лісце былы лепшэ" (у мінулым годзе па школе раскіданае было шматколернае клёнавае лісцее). Размаўляла я з Аняй, Асяй і Адрыянам — вучнямі, якія ў чацвер удзельнічалі ў „каменным уроку".

***— Якая была ваша першая рэакцыя на камяні на калідорах?***

— Шок. А пасля пытанне: што гэта? навошта? чаму? Пазітыўна, бо людзі разварушылі мазгі. Заўсёды было лісце, так што да канца не было вядома, што тут тыя камяні робяць. Мы ж да гэтай школы прыйшлі нядаўна, не бачылі плаката з 1998 года...

***— Не перашкаджае вам той „непарадак" у школе?***



Фота ЗОСІ ЛЕМЕШ

**Ася:** — Мне крыху так, асабліва калі камяні ляжаць паасобна, не ў рамках, пасярэдзіне калідора... Не ведаю таксама, чаму некаторыя з іх жоўтыя, зялёныя, сінія...

***— А як думаеце — колеры гэтыя абазначаюць нешта?***

— Чырвоны напэўна Беларусь, а іншыя — кожны сам можа сабе выдумаць значэнне. Такая невядомая заахвочвае зрэшты, каб пытаць.

***— Як правялі вы сённяшні ўрок беларускай мовы?***

— Супер! Чыталі мы вершы — маю нават кніжку Міры Лукшы (Адрыян дастае з заплечніка зборнічак). Спадарыня Грыгарук уключыла музыку і распавяла аб „Бардаўскай восені". Паказала нам плакаты з папярэдніх гадоў.

***— Які плакат вам найбольш спадабаўся?***

**Ася:** — Мне той з чырвоным камянём — скарыстаны для рэкламы.

**Аня:** — І мне камяні найбольш падабаюцца. Таксама гэты белы з чырвонай калінай прыцягнуў маю ўвагу.

**Адрыян:** — Я ў мінулым годзе пабываў на фестывалі. Паводле мяне, спецыфіку канцэртаў найлепш паказвае плакат з 1994 г., з белай гітарай на цёмным фоне.

***— Як ацэньваеце „Адкрыты праект беларускіх ліцэяў"?***

— Пазітыўна.

***— Хацелі б вы, каб такая акцыя адбывалася штогод?***

— Напэўна.

***— А будзеце дапамагаць пры арганізацыі, як зараз робяць гэта вашы старэйшыя сябры з Клуба беларускіх спраў ГРаБЛі?***

— Часу няма... Заняткі пасля ўрокаў... Многа дамашніх прац... здаецца, не будзем...

Трэба нагадаць, што праект не адбыўся б без вялікай дапамогі і зразумення з боку настаўнікаў, практыкантак і шмат каго яшчэ. Такія акцыі не толькі заахвочваюць настаўнікаў прыдумваць цікавейшыя заняткі, як мела гэта месца ў зале 105, але таксама могуць паўплываць на тое, каб наш ліцэй не быў „беларускім" толькі па назве. Самае важнае — на акцыю згадзілася дырэкцыя школы, а нават настолькі ёй брук спадабаўся, што вырашылі дзве рамы пакінуць у якасці пастаяннай экспазіцыі. Шкада толькі, што такога лібералізму няма ў бельскім белліцэі. Там сябры Клуба паклапаціліся, каб плакаты „Бардаўскай восені" не віселі незаўважанымі, але далёка ім да такой свабоды як у нас.

Зося Лемеш

Вачыма паляка

# Калаўротак тэлерэдактаркі

Не мог я паўстрымацца і не напісаць аб сваіх некаторых заўвагах наконт самаўрадавай выбарчай кампаніі. Калі пішу гэтыя словы, яна ў поўным разгары. Спраўвакавалі мяне перш за ўсё выбарчыя ўткі, якія паказаліся на антэне Тэлебачання Беласток. Літаральна я аж збялеў, бы той дурань, пачуўшы каментар тэлевізійнай рэдактаркі Малгажаты Сікорскай. Асабліва ад тэлевізійнага журналіста, які вельмі ўплывае на грамадскую думку, чакаць трэба было б развагі, глыбокага роздуму, а ў кантэксце выбараў — абароны звязаных з імі дэмакратычных прынцыпаў. Аднак на два тыдні да выбараў рэдактарка Сікорская рашыла проста пастрашыць кандыдатаў на радных, прэзідэнтаў, бурмістраў і войтаў. „Выбарчы калаўротак стаў круціцца. 11,5 тыс. падлясян адчулі Божую волю і рашылі стартаваць у самаўрадавых гонках. І выскачылі як Філіп з канапель пан X і пані У, людзі без прозвішча, без вопыту, без ідэй. Думаюць, што ім удасца, што зробяць шмат, у іх немалы апетыт. Але калі прыйдзецца ім тры сказы па-польску выказаць, тады — клопат, а калі ўжо аб сваіх дасягненнях загаварыць, дык сапраўдная драма. Бо дасягненні будуць, але тады, калі будуць яны ўжо самаўрадаўцамі, у што глыбока вераць. Ды сцеражыцеся, падляшскія Дызмы! Выбарчая каўбаса на пачатак можа хапіць. Ведаю таксама людзей, якія ўвайшлі ў самаўрад, не выказваючы публічна ні слова. А калі давядзецца падняць цяжкае рашэнне, будзеце расплачвацца з выбаршчыкамі. І з намі, журналістамі, таксама". Прыводжу выказванне рэдактар Сікорскае ў цэласці, каб хто не падумаў, што маніпулюю.

Чым для рэдактар Сікорскай ёсць выбары? Самі бачыце: „выбарчым калаўроткам", „самаўрадавымі гонкамі". Ужо з прадпасылкі кандытаты маюць у рэдактаркі Сікорскай „przechlapane"; яны несумленныя, дурныя, нават калі не браць пад увагу таго, што быццам бы па-польску ў трох сказах не выкажуцца. Яны бяздумна рашылі стартаваць у выбарах, а, як можна вывесці з патоку думак рэдактаркі, выскакваюць, каб хапануць уладу, а затым прывілеі. Не разумее тая рэдактарка, што немалая колькасць камітэтаў, а затым і іх кандыдатаў можа сведчыць не аб якой там „волі Божай", якую адчулі, але і ахвоце ўзяць адказнасць за развіццё гмін, паветаў, рэгіёнаў ды дабрабыт іх жыхароў і яшчэ большай групы грамадзян. Не разумее, што дэмакратыя дала кожнаму з нас без выняткаў такое права, і што „не па словах, а па чынах іх пазнаеце". Шкада мне рэдактар Сікорскай, якой выбары асацыююцца толькі з дэправацыяй, з разбэшчанасцю. Горш, калі яна свае асацыяцыі прабуе ўнушаць у публічным тэлебачанні, адной з місій якога рабіць усё дзеля развіцця г.зв. грамадзянскай свядомасці і заахвочваць да агульна разуметай грамадскай актыўнасці. З другога боку, цікавіць мяне, каго рэдактарка Сікорская мела на ўвеце, звязаючы на цяжкія закіды і канкрэтныя прэтэнзіі. На жаль, адвага рэдактаркі кончылася на знявазе і пагрозах.

Выпадкова ейны каментар (12 кастрычніка ў „Тыдні ў аб'ектыве") амаль не збегся з бясплатнай выбарчай кампаніяй падрыхтаванай выбарчымі камітэтамі. За дні, якія мінулі ад напісання гэтага тэксту, найбольш у вушы і вочы кідаліся кандыдаты і праграмы Лігі польскіх сем'яў (LPR) (бясплатны антэнны час залежаў ад колькасці зарэгістраваных спіскаў). Я дык зусім збаранеў, калі адзін кандыдат LPR у Падляшскі сейлік (не скажу прозвішча, каб не рабіць яму выпадкам рэкламы) заявіў, не маючы, як здавалася б, праблемы з выказаннем трох сказаў па-польску: „Nie ma sformułowania wielokulturowość. Jest jedna, polska kultura". Я апусціў рукі: не хочацца нават пракаментаваць такое. Але і гэты кандыдат мае права на тое, каб старацца здабыць мандат у самаўрадзе. І то назалежна ад таго, ці гэта каму падабаецца, ці не. Не выскачыў ён як Філіп з канапель, а хоча (разам з падтрымліваючым яго камітэтам, значыць, якойсьці там часткай грамадскасці) перакачаць да свайго менталітэту, з якім можа няварта дыскутаваць, але варта паслухаць, хаця б дзеля таго, каб ведаць, з якога боку можа набрысці пагроза для дэмакратыі. І думаю, што публічнае тэлебачанне павінна быць пільным пры такой небяспецы, а не падрываць ідэямі сваіх каментатараў існасць самаўрадавых выбараў — прывілеі і абавязку кожнага з нас.

Мацей Халадоўскі

# Зорка
старонка для дзяцей





Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

*На камені ля помніка князю Барысу (з анёлам Ахоўнікам) у Барысаве любяць фатаграфавацца дзеці*

# Рыбак і камень

Аднойчы рыбак Ёзік выплыў у мора. Плыў, плыў, гадзіну-дзве, як раптам пачуў чалавечы голас. Голас даходзіў ад астраўка. Рыбак жвава павярнуў у той бок. На астраўку ляжаў камень. Не, гэта не быў звычайны камень, з яго сярэдзіны даходзіў голас мужчыны.

— Дапамажы мне добры чалавек, — прасіў голас, — дапамажы мне выйсці на волю.

— Ну добра, — сказаў рыбак — толькі не ведаю, як цябе дастаць з каменя.

— Ідзі ў чорны лес, што за гарой, сарві там адзін лісток з асіны, прынясі яго сюды і палажы на мой камень, а ён ператварыцца ў чырвоны збан. Пасля пойдзеш на бераг мора і напоўніш збан вадою. На канец дадай у збан жменю ягад з яліны і перад захадам сонца палі мой камень.

Добры рыбак справіўся, як казаў яму голас з каменя. Яшчэ да заходу сонца ён паліў камень зёлкамі. Не мінула і пяць хвілін, як перад рыбаком стаў малады, вяльможны пан.

— Дзякую літасцівы чалавеча, — сказаў, — я князь Сагаір, сын Амара. Даўно таму зачаравала мяне ведзьма Анджэла, яна хацела знішчыць свет, а я супраціўіўся і тады стаў каменем.

Рыбак нізка пакланіўся вяльможу і сказаў:

— Мяне завуць Ёзік. Я рыбак з вёскі і рады, што вам дапамог.

— Я таксама рады, — сказаў князь, — а цяпер паслухай мяне, чалавеча:

— Служу вяльможнаму пану! — Ёзік стаў на зважай і пакорна слухаў.

— Згатуй мне страву, я галодны як воўк.

Рыбак пабег у лес і назбіраў ягад, карэньчыкаў, злавіў перапёлку. Праз гадзіну яда была гатова і князь з'еў усё ў пяць хвілін. Пасля Сагаір, сын Амара, загадаў рыбаку збудаваць плыт. Ён хацеў на ім дабрацца ў родны край.

Ёзік напяў усе сілы і неўзабаве плыт быў гатовы.

Князь развітаўся з рыбаком. Не сказаў, што калі хто сам застанецца на востраве, пранікне ў камень. І вось, князь Сагаір адплыў у свой край, а рыбак Ёзік пранік у камень.

І так ужо мільён гадоў наша гісторыя паўтараецца на астраўку, на моры.

(нак-с)

Андрэй Выдмінскі

## *Заяц і сарока*

Інэс-Сінічцы

*Недалёка, пад лясочкам*
*Зайка снедае звычайна.*
*Зверху бачыць усё сарочка*
*І злуецца апантана:*
*— Ну, ідзі адсюль, зайчыска,*
*Бо паклічу сюды Муху!*
*Муха гоніць зайцаў чыста!*
*Выдзярэ з цябе ён пуху!*
*— Ты не кліч яго, сарока,*
*Бо ж не жарты з тым сабакам.*
*Лепш пакіну ўзлесак бокам,*
*Каб не лезці з Мухам у драку!..*
*Паміж дрэвы зайка скокам,*
*А сарока фыр-р-р! — у злосці.*
*Напарола на сук вока.*
*Кара злоснай яемосці!*

Пераклала з польскай
Міра Лукша

Артур Вольскі

## *Вавёрка*

*Яліна ў свет*
*глядзіць з пагорка.*
*А на суку сядзіць*
*вавёрка.*

*Яна знайшла*
*ў ствале дупло*
*і ўладкавала тут*
*жытло.*

*Хай дождж,*
*хай снег,*
*хай завіруха,*
*а ў хатцы —*
*ўтульна,*
*цёпла,*
*суха.*

*І ежы,*
*скажам шчыра,*
*лішак:*
*аж да вясны*
*ёй хопіць шышак.*

Віктар Швед

## *Англійская мова*

*— Не разумею, — скардзіцца Вова, —*
*Чаму вывучаць мне англійскую мову?*
*Тлумачыць мама: — На мове гэтай*
*Ужо гаворыць палова свету.*

*Па-моему, час надыдзе скора —*
*На ёй планета ўся загаворыць.*
*— А ці не хопіць, — азваўся Вова, —*
*Нам англамоўнай гэтай паловы?*

**Уладзімір Арлоў, Адкуль наш род**

# Паўстанне Тадэвуша Касцюшкі

### Правадыр змагароў

Перш чым расказаць пра паўстанне нашых продкаў супроць расійскага панавання, пагаворым пра чалавека, які стаў правадыром змагароў.

Тадэвуш Касцюшка паходзіў са старога беларускага роду. Ягонае дзяцінства прайшло ў бацькоўскім маёнтку Мерачоўшчына паблізу ад мястэчка Косава (цяпер Івацэвіцкі раён Брэсцкай вобласці). Сям'я Касцюшкаў у той час жыла ў сціплым драўляным доме пад саламянай страхой. Шмат вандруючы па свеце, Тадэвуш потым часта ўспамінаў прыгожыя беларускія краявіды вакол ракі Шчары, у якой ён у дзіцячыя гады любіў купацца і вудзіць рыбу.

Спачатку хлопчык асвойваў навуку ў недалёкай ад роднага дома вучэльні манахаў-піяраў. Тут ён вывучаў гісторыю і лацінскую мову, матэматыку і фізіку, красамоўства і культуру паводзінаў.

Пасля вучэльні Касцюшка паступіў у Варшаўскі кадэцкі корпус. Такія корпусы рыхтавалі афіцэраў для войскаў Польшчы і Вялікага княства Літоўскага. У тыя гады сябры празвалі Тадэвуша „Шведам з-пад Берасця". Такую незвычайную мянушку ён атрымаў за тое, што хацеў быць падобным да выдатнага палкаводца — шведскага караля Карла XII. Беручы з яго прыклад, Касцюшка штодня падымаўся а чацвёртай гадзіне раніцы і, каб не заснуць, апускаў ногі ў пастаўленую пры ложку балею з ледзяной вадой. Так ён загартоўваў сваю волю.

Вайсковую навуку Тадэвуш працягваў у Парыжы. Грошай ён меў мала, і часта сняданак і вячэра ў яго былі аднолькавыя — булка і шклянка кавы. І ў кадэцкім корпусе, і ў Парыжы Касцюшка займаўся яшчэ і маляваннем. З яго мог бы атрымацца добры мастак, але лёс вырашыў іначай.

Жыццё Тадэвуша склалася так, што, прыехаўшы з Парыжа, ён пражыў на радзіме вельмі мала. Якраз у тыя гады Паўночная Амерыка ваявала з Англіяй за сваю незалежнасць. Касцюшка сеў на карабель і выправіўся за акіян. У Амерыцы ён стаў у шэрагі змагароў за свабоду і дзевяць гадоў ваяваў на іх баку. Ён удзельнічаў ва ўсіх буйных бітвах з англічанамі, атрымаў чын генерала і стаў ганаровым грамадзянінам Злучаных Штатаў Амерыкі.

Калі Касцюшка вярнуўся дадому, у Беларусі адбываліся трывожныя падзеі. Расія, Аўстрыя і Прусія ўжо дзялілі Рэч Паспалітую і ўводзілі на захопленых землях свае парадкі. Беларусы, палякі, жамойты — усе, хто любіў Бацькаўшчыну, не маглі змірыцца з гэтым здзекам.

(працяг будзе)

# Камяні на калідорах

8 кастрычніка гэтага года на калідорах Комплексу школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Гайнаўцы паявіліся кампазіцыі з камянёў. Яны выглядалі parознаму. Можна было пабачыць камяні, паскладаныя ў маленькія ўзгорачкі, а таксама такія, якія ляжалі ў драўляных рамках. Камяні паявіліся ў найменш спадзяваных месцах. Ці гэта было сапраўднай нечаканасцю — пераканаліся некаторыя настаўнікі.



Фота АНДРЭЯ ГРЫГАРУКА



Фота ІАЛАНТЫ ГРЫГАРУК

Як я даведаўся з маёй „тайнай крыніцы”, гэта была рэклама „Бардаўскай восені” — Фестывалю бардаўскай і аўтарскай песні ў Бельску-Падляшскім.

10 кастрычніка змяніў таксама выгляд клас „105”. Гэтага дня паявілася там многа жоўта-чырвонага лістоўя. Дэкарацыя была намнога больш прадуманая, чым у мінулым годзе. Усё гэта мне вельмі спадабалася. У гэтыя дні настаўнікі не маглі спяшацца на ўрокі, а вучні бегаць — не дазвалялі ім камяні.



Фота АНДРЭЯ ГРЫГАРУКА

Андрэй Грыгарук

### *Нельга пакараць*

*Настаўніцу пытае Косцік,*
*Чым выклікае вучняў здзіў:*
*— Ці можна пакараць кагосьці*
*За тое, чаго ён не зрабіў?*

*— Дык нельга пакараць, вядома, —*
*Настаўніца дае адказ.*
*— Я не зрабіў задання дома*
*І не прынёс сягоння ў клас.*

Віктар Швед

# *Дзённік Міколы*

**Вяснушкі ўпартай Веранікі**

На другі дзень мае бацькі і сёстры паехалі да бабулі Ліды і цёці Лізы, а я застаўся дома адзін. Паснедаўшы, я пабег да Ані і расказаў ёй чарговы аповед Нор Узі. Аня ўсміхнулася і сказала:

— І ты яму паверыў?

— Паверыў. Чаму ж не?

— Ой, Мікола, — Аня зірнула мне проста ў вочы, — ён прыдумаў гэтую гісторыю дзеля нас, падлеткаў, разумееш.

— Як — прыдумаў? — я не мог пагадзіцца.

— Нармальна! — Аня пачала смяяцца ўголас. — Ведаеш, я ўчора расказала сваёй маме пра таго ката, а яна спыталася: „Гэта Нор Узі вам гаварыў, так?” Мама растлумачыла мне, што гэтую гісторыю трэба схаваць між казкі. Чорны кот — гэта звычайны кот, а так увогуле, дык Нор Узі ніколі не меў брата, толькі сястрыцу Алісу.

— Хочаш сказаць, што ён пачаставаў нас *буйдай*?! — абурыўся я.

— Я ўсяго яшчэ не сказала, — Аня зноў глянула мне проста ў вочы і запытала:

— А ведаеш, чаму той кот гаварыў чалавечым голасам?

— Не, не ведаю.

— Бо гэта Нор Узі, так, Нор Узі — чараўнік.

— Ну і навіну мне ты сказала, — я пляснуў у далоні. — Цяпер ведаю, пра што напішу сваю кніжку! Ты, пэўна, чула, адкуль пасыпаліся вяснушкі ва ўпартай Веранікі, га?

— Ага, — пагадзілася Аня. — Мне падказаў гэта Тамаш і Ярак.

— Давай, зойдзем да іх, — я падняўся з фатэля, але Аня ні пра што не хацела слухаць.

— Найперш трэба даведацца, хто ўчора званіў у дзверы мастаку! — не адставала Аня.

Таямнічы званок у дзверы здзівіў усіх, нават Нор Узі выглядаў на ашаломленага. Усе думалі, што гэта спадарства Лінэцкія, новыя кватаранты. Аднак, калі мастак адчыніў дзверы, за імі не было нікога. І нічога...

(працяг будзе)

(нак-с)



Фота МІХАЛА МІНЦЭВІЧА

# „Ілюзія” з Гайнаўкі

Рытмічная музыка, танец у такт, дзявочы поваб — так можна ахарактарызаваць „Ілюзію” — дзявочы калектыў сучаснага танца, які працуе ў Гайнаўскім доме культуры. Аснову групы складаюць вучаніцы Гімназіі н-р 3 з беларускай мовай навучання.

Размаўляем з Аннай Баран, мастацкім кіраўніком гурту.

***— Як узнікла група, якая ў вас праграма і хто выступае?***

— Наш калектыў малады, выступаем другі год. Сустрэліся ў ім дзяўчаты, якія хацелі танцаваць нешта іншае за фальклор і бальныя танцы. Ішло пра танец бліжэйшы *дыска* і так яно пачалося... Думаю, што ў нас нешта ўжо атрымоўваецца. Назву гурту дзяўчаты прыдумалі нядаўна і думаю, што „Ілюзія” падыходзіць (значэнне слова — *скажонае ўяўленне, уражанне заснаванае на падмане пачуццяў; прыняцце ўяўнага за сапраўднае*).

Наша праграма па сённяшні дзень трымаецца на танцах *поп*, аднак мы падумалі, што пачнем працаваць у кірунку тэатральнага танца.

У калектыве выступаюць: Дарота Яблонская, Марта Дубковіч, Уля Ляшкевіч, Сільвія Барodзей, Марлена Давідзюк, Караліна Пільская, Альжбета Карэтка, Магда Літвінюк, Дыяна Масальская.

Рэпетыцыі праводзім два разы ў тыдзень, па дзве гадзіны.

***— Адкуль ідэі?***

— Проста — з галавы, — падказвае музыка, супольна шукаем адпаведны крок.

***— Праблемы?***

— У асноўным — фінансы. Хацелася б мець касцюмы. Пакуль самі вырашаем гэту праблему — у Доме культуры ёсць жанчына, якая, калі трэба, нешта пашые, дапамагае нам.

***— Поспехі?***

— Пакуль, няма пра што гаварыць. Мы толькі пачынаем. Наша першае выступленне — гэта ў час Арлянскіх сустрэч. У мінулым годзе мы многа працавалі над праграмай. На сённяшні дзень маем многа ахвотных у „Ілюзію”. Хочам развіваць калектыў і дасканаліцца.

***— Жадаю поспехаў.***

Гутарыў Міхал Мінцэвіч

# Польска-беларуская крыжаванка № 43

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку”. Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.




**Адказ на крыжаванку н-р 39:** Дуб, ліпа, апора, парог, паратунак, бурак, запас, торбачка, вага, норма. Душа, брава, пуп, прылада, парасон, корак, рот, дзбан, ламут, чар, падарунак, рада.

Узнагароды, **аўтаручкі**, выйгралі: **Анна Хількевіч**, **Ілона Асіпюк** і **Анна Бурак** з Бельска-Падляшскага.



Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

*Пра свае фатаграфіі расказваў Славамір Кулік (першы злева)*

# Сакральныя гарызонты

На выстаўку фатаграфій Славаміра Куліка і Гжэгажа Пятрашка „Сакральныя гарызонты”, якой адкрыццё адбылося 11 кастрычніка ў галерэі „Гайна”, што знаходзіцца ў Беларускім музеі ў Гайнаўцы, прыйшлі пастаянныя наведвальнікі і людзі зацікаўленыя сакральным будаўніцтвам. На здымках можна пабачыць праваслаўныя цэрквы, капліцы і крыжы з Гайнаўшчыны і Бельшчыны, каталіцкія святыні і мячэць у Крушынянах.

Побач уваходу на выстаўку размешчаны вершы Славаміра Куліка на беларускай мове, а каля іх фатаграфіі цэркваў на Гайнаўшчыне. На многіх здымках паказваюцца прыдарожныя крыжы і капліцы на фоне прыгожых краявідаў. Прырода паказана ў розныя поры года і дня, пры розным надвор'і. Славамір Кулік паказаў цікавыя дэталі крыжоў і святыняў. Загаловак для выстаўкі прыдумаў мастацкі апякун галерэі Віктар Кабац.

— Раблю здымкі, каб увекавечыць людзей, прадметы і будынкі, не дазволіць ім загінуць, — сказаў Славамір Кулік.

Гжэгаж Пятрашак прадстаўляе прыгожыя фатаграфіі цэркваў і крыжоў з Беласточчыны. Дапаўненнем яго калекцыі была дэманстрацыя слэйдаў цэркваў, зробленых у Карпатах.

Аляксей Мароз

# Фільмавы вечар

Кінатэатры прапануюць гледачам апошнім часам шмат фільмаў. Я са свайго боку прапаную чатыры з іх.

„Ведаем жанчын” — гэта камедыя, дэтэктыў і мюзікл французскай прадукцыі ў рэжысуры Франсіса Азона, які пераносіць нас у 60-я гады, у сферу багатых жыхароў сталіцы.

Адбываецца злачынства — мужчына гіне ў сям'і ў дзіўнай абстаноўцы, а вінаватай з'яўляецца адна з жанчын. Каторая? Цяжка даведацца, бо ўсе лгуць. Зайздрасць, здрада, шаленства — усё выказана танцам, песнямі. На экране пабачым найпрыгажэйшых жанчын Францыі: Катрын Дэнэф, Ізабэл Гаперт і Фаны Ардан.

„За дзвярыма спальні” Тода Філда спадабаецца аматарам моцных уражанняў.

Малады мужчына — Фрэнк, праводзіць канікулы ў роднай хаце. Яго мара — архітэктура. Каб гэта ўдалося, працуе ў порце, а пры нагодзе спатыкаецца з Наталі. Сяброўка мае двое дзяцей і зайздроснага былога мужа, што не падабаецца Фрэнкавай маці, якая да гэтай пары рашала аб тым, што з'яўляецца найлепшым для сына. Бацька даверае сыну, аднак не ведае як быць у такой сітуацыі.

Зайздросны муж забівае Фрэнка і жыццё яго бацькоў зямняецца ў кашмар. Роспач і боль такія вялікія, што прыводзяць герояў да наступнай трагедыі — забойства. На экране бачым Тона Вілкінсана, Сісі Спэйсэк, Марсію Тамэй і Уільяма Мапотэра.

„Кіназорка” ў рэжысуры Сільвестра Латкоўскага прадстаўляе сапраўднае жыццё аднаго з папулярнейшых музыкаў Польшчы — Міхала Віснеўскага — лідэра гурту „Іх трое”.

Рэжысёр паказвае Віснеўскага, як куміра не толькі маладых, але і старэйшых людзей, якія заўсёды сустракаюць яго апладысментамі. Аднак жыццё куміра не з'яўляецца простым. Журналісты падкупляюць суседзяў, каб атрымаць навіны з сямейнага жыцця героя, а моладзь пераймае кожны яго крок. Фільм з'яўляецца дакументам, які здзіўляе, выклікае задуму.

„Галапагас” — гэта навіна ў нашых кінатэатрах. Рэдка маем магчымасць глядзець на вялікім экране фільм аб прыродзе. Рэжысёры Ал Гідінгд і Дэйвід Кларк прадстаўляюць цудоўныя краявіды, глыбіню акіяна і жыццё жывёл Галапагаса.

Паўліна Шафран

# Узнагароды выдатнікам

У мінулым годзе Павятовае староства ў Гайнаўцы ўстанавіла ўзнагароды выдатнікам, якія ўдзельнічалі ў праграме Польскія дні рэцыклінгу, якая тычылася зборкі паўторнай сыравіны. Арганізатары ўстанавілі крытэрый ацэнкі на аснове якога вылучаліся найлепшыя. У чаромхаўскай Пачатковай школе ў мінулым навучальным годзе ў зборцы ўдзельнічала 96 вучняў, якія калектыўна набралі 32 337 ачкоў. Пераможцамі аказаліся: Марэк Ярмуловіч з ІІІ „а” класа (3 071 ачкоў), Віялета Віневіч з ІІІ „б” (2 399) і Моніка Кузьма з ІІІ „а” (2 045). Усе яны атрымалі веласіпеды. Шасцярых вучняў атрымалі самакаты, а трынаццаць іншых — плэеры, ракеткі і ранцы. Пры меншай колькасці ачкоў удзельнікі атрымоўвалі футбольныя мячы. Узнагароды так паўплывалі на вучняў, што з пачаткам новага навучальнага года многія з першых дзён заняліся зборкай паўторнай сыравіны. Карысная гэта акцыя — школьнікі прывучаюцца рабоце, а заадно і пасёлак стане чысцейшым.

(ус)

# Кнігі з WSiP




Школьныя і педагагічныя выдавецтвы (WSiP), дзяржаўнае польскае прадпрыемства якое ад паўстагоддзя апрацоўвае і друкуе падручнікі і дапаможнікі, цяпер акцыянернае таварыства, даслала ў „Ніву” тры кнігі для беларускіх школ. Гэта два падручнікі Тэрэсы Ясінскай-Сохі — *Беларуская мова* для V класа пачатковай школы і *Родная мова* — падручнік па граматыцы для вучняў гімназіі ды *Са словам праз стагоддзі*, падручнік па літаратурнай і культурнай адукацыі для вучняў І класа сярэдніх школ, які апрацавала Вольга Сянкевіч з Гайнаўскага белліцэя.

Сапраўды, кнігі для дзяцей вельмі часта характарызуюцца, калі браць пад увагу эстэтычны бок, такім мастацкім аздабленнем, якое павінна зацікавіць і ўцешыць дзяцей. Ці, калі пісаць пра падручнікі, тым больш беларускія, гэта недарэчы? Выдатная апрацоўка граматыкі, празрыстасць і яснасць у выкладванні, што ўплывае на разуменне і запамятанне дзецьмі матэрыялу (гэтак можна сказаць пра абедзве кнігі Т. Ясінскай-Сохі) — гэта самае важнае. А малюнкі, прыгожыя і каляровыя (для пяцікласнікаў) — такія, як і ў любым падручніку для польскамоўных дзетак. Добра, што хоць дзеці могуць пазнаць на здымку сваю школу (Нараўчанская) ці фрагмент мястэчка (управа гміны ў Чаромсе)... Бусел з жабкай на вокладцы, гуляючы літарамі жанглёр-настаўнік (ці вучань, які валодае па-майстэрску мовай?)?.. Іначай у кнізе Вольгі Сянкевіч — сама вокладка кнігі, на якой выкарыстана літаграфія Маргарыты Дмітрук і матывы з яе мастацкае тканіны-світэра (птушкі) ужо на першы погляд прапануюць штосьці адметнае ды сучаснае — беларускае. У кнізе — здымкі, рэпрадукцыі карцін і дакументаў, застаўкі з народным узорам. Дарэчы, кніга вельмі сучасная, і па змесце; „сумясціць несумяшчальнае” (загаловак пра моду XXI стагоддзя з тэксту перадрукаванага з часопіса маладых літаратараў „Першацвет”), а побач — сучасная музычная альтэрнатыва, тэксты навеяныя „дымам стагоддзяў”, з нашае старажытнасці, „тамтэйшыя” і „тутэйшыя”, разам са славутым „Бацькоўскім парогам” Віктара Шведа і іншых „белавежцаў” і аўтарамі, якія выкляты сёння са „школьнай” літаратуры ў Рэспубліцы Беларусь... Розныя жанры, аўтары ўсіх пакаленняў, таксама і наймалодшыя пісьменнікі. Падставы ведаў пра беларускую культуру ад яе пачатку, вялікія постаці дзяржаўнасці і культуры, і „звычайнай меры чалавечнасці” (Мікола Гайдук)... З цікаўнасцю гартаеш гэты падручнік і, хоць табе гэта знаёма, з ахвотай перачытваеш, прыгадваеш, запамятваеш забытае. Настольная, родная кніга. Да таго элегантная з выгляду, улежная ў руцэ. Відаць, што з любоўю роблена — складвана, друкавана...

Шмат кніжак цяпер атрымалі мы для навукі.

Міра Лукша

# У БГКТ

Галоўнае праўленне Беларускага таварыства закончыла цыкл летніх народных фэстаў у паасобных мясцовасцях. Апошнія мерапрыемствы адбыліся ў Дуброве-Беластоцкай і Саколцы. У канцэртах, між іншым, выступіў народны хор „Ярыца” з Мастоў, што на Гродзеншчыне. Сваім мастацтвам захапляў ён таксама прысутных у памяшканні ГП БГКТ. Вось гэтым канцэртам ГП БГКТ распачало спатканні з беластоцкімі сімпатыкамі беларускай культуры.

25 верасня на БГКТоўскай сцэне выступілі самадзейнікі з Залук (Гарадоцкая гміна) са сцэнкай „Сварка ў хаце”. Добра зарэкамендаваліся таксама вучні Пачатковай школы з гэтай жа вёскі, якія займаюць пераважна першыя месцы ў школьных конкурсах. Мастацкім кіраўніком успомненых гуртоў з'яўляецца Валянціна Паплаўская.

„Дажынкі”, аўтарства Ніны Цыванюк, прыпомнілі прысутным цяжкае жыццё сялян, якія хадзілі на заробкі ў абшарніцкія маёнткі. Выступіў таксама мастацкі калектыў „Асенні ліст”, з абрадавай сцэнкай „Кудзельніцы”. Звычай гэты ўжо рэдка выступае на вёсках. Змест пастановак у абодвух гарадоцкіх калектывах пераплятаўся прыгожымі беларускімі песнямі.

5 кастрычніка прыехалі ў Беласток самадзейны гурт „Каліна” з Дашоў, што ў Кляшчэлеўскай гміне, пад кіраўніцтвам Зосі Кердалевіч, „Журавінкі” з Агароднічкаў (гміна Супрасль) пад кіраўніцтвам Ніны Аўгустыновіч, ды „Арэшкі” з Арэшкава (Гайнаўская гміна) пад кіраўніцтвам Надзеі Грушэўскай. Успомненыя тры самадзейныя калектывы не маюць прафесійных кіраўнікоў. Выконваюць гэтую ролю самародныя вясковыя таленты. „Каліна” выступіла са сцэнкай „Колішнія вячоркі”. Жанчыны прадуць кудзелю, вяжуць на прутках, жартуюць, пяюць.

„Журавінкі” прыехалі з „Канапелькай” (у некаторых мясцовасцях называецца яно „валоканне”).

„Арэшкі” — калектыў з трыццацігадовым стажам самадзейнасці, у прыгожым народным беларускім адзенні прадставілі „Дажынкі”. „Жыта мы дажалі, перапёлку ўбіралі” — спявалі прыгожа не толькі абрадавыя, але і іншыя мілагучныя беларускія песні.

Выступіў таксама мастацкі калектыў з Гарадка „Асенні ліст” са сцэнкай „Вячоркі”, на якіх пераважна пралі кудзелі, закранaлі свае жыццёвыя справы, спявалі.

* * *

27 верасня г.г. адбылося пасяджэнне Прэзідыума ГП БГКТ, прысвечанае дзейнасці БГКТ у летні сезон. Інфармацыю на гэтую тэму прадставіла сакратар ГП БГКТ Валянціна Ласкевіч. Старшыня ГП БГКТ Ян Сычэўскі паінфармаваў аб падрыхтоўцы да выбараў. Сцвердзіў, што БГКТ ідзе да выбараў у самаўрады з СЛД і іншымі групоўкамі ў залежнасці ад мясцовасці і ўмоў там існуючых. Апошні пункт пасяджэння датычыў прызначэння грашовай узнагароды Валянціне Ласкевіч за вялікі ўклад працы ў падрыхтоўку і правядзенне беларускіх народных фэстаў.

М. Х.

# Місія ў Жацераве

Новы Свержань — мястэчка, дзе хрысцілі Якуба Коласа. У цэнтры касцёл, царква, крама. Група падлеткаў у старэнькім „Запарожцы” кайфуе ад музыкі „тэхна”. Не ведаючы, як паказаць дарогу на Мядзьведку. Паводле карты, ляжыць яна недзе па-суседску. Няма ўказальнікаў. Інфармацыйны кашмар. Трэба пра ўсё пытаць, заходзіць у хату, на панадворак.

Наш шафёр справу разумее па-свойму. Навошта перціся ў нейкую глухамань? Там нічога няма! Частуе нас цынічнымі каментарамі:

— Вам, наверна, камні нада пасматрэць? — і як той бонза садавіцца ў машыну. — Ах, какія вы чудакі! — кідае яшчэ пад носам.

А мы ідзем пытаць пра дарогу. Смешна тут, як нідзе. Каго не спытаеш — той кіруе... кожны ў іншы бок:

— Што? Мядзьведку і Паланэчку вам трэба? Едзьце прама і павярніце ўлева.

Калі прыязджаем у паказанае месца, дарога паварочвае... управа.

— Вам трэба развярнуцца і павярнуць улева, там і Мядзьведка, і Паланэчка будзе, — талкуе іншы. Кружыцца ў галаве. Страшна і смешна. Можам згубіць арыентацыю. Шафёр цешыцца: завязе нас пад „дурнога хату”.

* * *

У касцёле знаёмімся з ксяндзом Яраславам Зарацкім. Маем шчасце. Ксёндз ведае пра ўсё — пра Мядзьведку, пра Паланэчку, пра Мархачоўшчыну і нават пра Жацерава. Сам ён паляк.

— Ад Коніна естэм, — кажа на беларуска-польскай мове. — Харошы наш ксёндз, — захвальвае свайго пастыра Раіса Цыркідзе. Жанчына ў чорным адзенні называе сябе каталічкай-беларускай. Па-беларуску не ўмее гаварыць, трыццаць тры гады жыла замужам у Грузіі, забылася. Як успыхнула там вайна, прыехала ў родны Свержань даглядаць хворага брата. У Грузіі ў той час памёр нечакана муж.

— Цяпер да смерці мушу хадзіць у чорным адзенні, — кажа Раіса. Дзякуе нам, што наведалі іх касцёл, што не мінулі іх мястэчка.

У Новым Свержані, на дзве тысячы жыхароў, сорак дзве каталіцкія сем'і. Нядзельныя багаслужбы тут на беларускай мове. У будні — па-польску.

— Такі раздзел, каб дагадзіць маладым і старым. Наша моладзь хоча маліцца па-беларуску, — кажа ксёндз Яраслаў. Бачыць у гэтым шанц на адраджэнне Беларусі.

Пытаем пра апазіцыю і вядомых тут беларусаў.

— Ёсць адзін такі беларус, — ксёндз шукае ў думках яшчэ нейкага, ды здаецца: — У нас клічуць яго „адраджэнцам”.

* * *

Ксёндз Яраслаў Зарацкі сам пакажа дарогу ў Мархачоўшчыну і Жацерава. Разам з нашым Вячаславам едзе на сваёй легкавушцы спераду, а мы, як сапраўдная „замежная дэлегацыя” за ім, на „Ambulansie”. У Мархачоўшчыне знаходзім камень з таблічкай:

*Мархачоўшчына. Тут бывалі беларускія паэты Уладзіслаў Сыракомля і Янка Лучына падчас арандавання фальварка іх бацькамі.*

Валун, аброслы пустазеллем, у цэнтры мясціны, ля Дома культуры.

Аляксандр Кандратовіч (бацька Сыракомлі) арандаваў фальварак Мархачоўшчына ў 1834-1840 гадах, а Люцыян Неслухоўскі (бацька Янкі Лучыны) у 1863-1897 гадах. З Мархачоўшчынай звязаны многія творы Янкі Лучыны. Паэт-інжынер любіў прыязджаць сюды на адпачынак з Мінска. У маладыя гады захапляўся паляваннем і рыбалкай. Мастацкі вобраз Панямоння выявіўся ў яго беларускіх, польскіх і рускіх творах. Паляўнічыя замалёўкі Лучыны напісаны ў традыцыі Сыракомлі, Адама Міцкевіча і Міколы Гусоўскага. Пасля сустрэнем іх у „Новай зямлі” і многіх творах Якуба Коласа. Вось, напрыклад, верш Лучыны „Развітанне” жыва напамінае пачатак „Пана Тадэвуша” і „Новай зямлі”:

*Пакінуць мушу вас, палі, гаі, паляны,*
*Дзе вее вецер свой з-за Нёмана духмяны,*
*Дзе шэпча пра тужлівасць ля яліны хвоя.*
*Малю ў цябе, мой Божа, ласкі я на тое:*
*Калі на скон жыцця мая ачахне сіла,*
*Калі застыне сэрца што Літву любіла,*
*Няхай мяне цвінтар у вёсцы той прыхіліць,*
*Дзе кожны ўзгорак кажа: „Ці ты помніш хвілі,*
*Як з стрэльбай за плячыма, малады, вясёлы,*
*Ты абгагаў ахвотна з дзесяць міль наўкола.**

Дом культуры ў Мархачоўшчыне стаяў зачынены. Калі мы папыталі пра Янку Лучыну ў напатканага вяскоўца, дзядзька адказаў:

— Не чуў пра такога.

* * *

— У Жацераве ўсё зацерлася, — кажа Рэгіна Васілевіч, кіраўнік Дома культуры. Ніколі не чула пра сувязь Янкі Лучыны з іх вёскай. У народзе захавалася памяць пра ўрочышча „Двор”. І хаця Рэгіна Васілевіч мае поўныя рукі работы, ёй трэба падрыхтавацца да калгаснага свята, сядае з ксяндзом у машыну і едзе паказаць нам „Двор”. На вуліцы, якая цягнецца кіламетры два, перашкоды. Пастухі заганяюць з папасу кароў у калгас „Чырвоны сцяг”. Каровы тармозяць рух, як на злосць, не хочуць саступіць з дарогі. Пахне малаком. Рэчка Жацераўка, якую ўпамінае Янка Лучына (і якая ў яго ўяўленні мае тры метры шырыні), сёння раўчук.



Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Злева: Анна Сабэцкая, кс. Яраслаў Зарацкі, Раіса Цыркідзе і Лена Глагоўская

Кіламетр за вёскай, на ўзгорку, з якога шырокая панарама на даліну рэчкі, растуць дрэвы. Стары сад. Сярод дрэў — вясковая хатка. Стаім і наракаем, што не паставілі тут каменя. Як з-пад зямлі, з-за ўзгорка паказваецца машына. Дзядзька ў форме цікавіцца — чаго шукаем разам з ксяндзом у полі? Калі чуе пра нашу місію, ідзе ў машыну і прыносіць садавіну. Дзяўчат частуе грушкамі.

— Гэта наш агранам Барыс Барысавіч Барысевіч, — знаёміць пані Рэгіна.

Гаворым пра засуху, якая сёлета наведала Жацерава і ўсю Беларусь. І Беласточчыну. Ксёндз з парафіянамі размаўляе па-беларуску, і некаторыя з нас такі цуд бачаць упершыню.

Дарога ў былы маёнтак, дзе ў пачатку XX стагоддзя гаспадарыла сям'я Янкі Лучыны, пазначана. Аздабляе яе кляновая прысада.

* * *

У Жацераве зноў кіруюць нас на Мядзьведку. Па дарозе думаю пра нюансы літаратурных сюжэтаў. У гісторыі беларускай літаратуры ролі паноў і мужыкоў рэзка мяняліся, напрыклад, у творах Сыракомлі і Янкі Лучыны паны любілі сваіх сялян, вучылі цвярозасці, пашаны. У Коласа — інакш. Мужыкі помсцяць панам...



Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Рэгіна Васілевіч — дырэктар Дома культуры ў Жацераве

А хопіць зірнуць у літаратурна-культурны кантэкст XIX стагоддзя. Рэжа несправядлівасць. Відаць простым вокам, што на феномен мужыцкіх песняроў Якуба Коласа і Янкі Купалы запрацавалі — не хто іншы як тамтэйшыя паны — з Залучча, Жукавага Барка, Жацерава, Мархачоўшчыны, Тулёнкі, Мядзьведкі...

Ганна КАНДРАЦЮК

*„Развітанне” з польскай на беларускую мову пераклаў Уладзімір Мархель.

# Плеяда вечных пісьменнікаў

Адзін пісьменнік-класік (не помню яго прозвішча) сказаў менш-больш так: калі хаця адна кніжка пісьменніка застанецца ў памяці людзей на працягу ста гадоў, дык яе аўтара трэба лічыць вечным. І я думаю, што сярод нашых пачэсных літаратараў „Белавежы” некаторыя ў гэтым ліку апынуцца, напрыклад, Віктар Швед, Ян Чыквін, Алесь Барскі, Васіль Петручук і іншыя.

Нядаўна мой сын спытаў мяне, дзе ў маім кнігазборы знаходзіцца кніжка Васіля Петручука „Пожня” на польскай мове („Ściernisko”), якую ён захацеў прачытаць, бо яна сёння стала вельмі моднай. Яна ў мяне ёсць, але мне цяжка было яе знайсці ў маёй вялікай бібліятэцы; усё ж такі знайшоў.

Васіль Петручук напісаў нямнога кніжак, але „Пожня” ўстанавіла ўсе рэкорды. Я калісьці, па сваёй дурасці, дрэнна аднесціўся да гэтай кніжкі і яе аўтара. Дайшло нават да вялікага канфлікта, а гэта толькі таму, што я не ведаў жыхароў Грабаўца, іх натуры і менталітэта, але калі пазнаў, дык сам сабе сказаў: Васіль Петручук усё дакладна і праўдзіва апісаў у сваёй аповесці. Яшчэ раз я вельмі дакладна прачытаў „Пожню” і даў ёй выдатную ацэнку. І яшчэ раз сардэчна Васіля Петручука перапрашаю.

Мая шчырая прапанова: „Пожня” зноў павінна пабачыць белы свет і яе абавязкова варта выдаць. Нам, старэйшым, гэтая кніжка лепш гучыць на роднай, спадчыннай беларускай мове. Але нашы дзеці і ўнукі маюць большае жаданне ўбачыць яе на польскай мове.

Хто можа выдаць гэту кнігу на польскай мове? Думаю, што рэдакцыя „Нівы” справіцца з гэтай задачай і гэтая кніжка не пакрыецца пылам, а нашы людзі будуць яе купляць і чытаць ад дошкі да дошкі. „Пожня” напэўна вытрымае сто гадоў і Васіль Петручук увойдзе ў плеяду вечных пісьменнікаў, чаго Яму жадаю з цэлага сэрца.

Мікалай ПАНФІЛЮК

# Канцэрт „Гарадніцы”

Слова дасканалы рэдка прыходзіцца выказваць, калі датычыць яно мастацкага ўзроўню харавых і танцавальных калектываў. Але калі гаварыць пра калектыў „Гарадніца” з Гродна, дык ён заслугоўвае на такое акрэсленне. Хто прысутнічаў на яго канцэрце, значыць, пабываў на шыкарным, беларускім духоўным банкеце.

13 кастрычніка г.г. „Гарадніца” выступіла ў памяшканні ГП БГКТ у Беластоку. 12-асабовы ансамбль песні і танца пад мастацкім кіраўніцтвам Алеся Лойкі, дырэктара Абласнога метадычнага цэнтра культуры і балетмайстра Віктара Старавойтава захапіў прысутных сваім песенным, танцавальным і музычным майстэрствам. Многія песні з іх рэпертуару знаёмыя беластоцкім сімпатыкам нацыянальнай духоўнай культуры. Гэта праўда, але так прыгожага, дасканалага выканання, могуць пазайздросціць беларускія мастацкія гурты Беласточчыны. Выступленне „Гарадніцы” — высокае майстэрства, дасканаласць. Вялікай атракцыяй і асаблівасцю быў той факт, калі прысутныя на канцэрце беластачане былі запрошаны да танца некалькімі гродзенскімі артысткамі і артыстамі, якія сышлі са сцэны і пад прыгожую музыку ансамбля станцавалі два танцы. І яшчэ адна асаблівасць. Калі Алесь Лойка заявіў, што прагучыць у памяць нядаўна памерлага гродзенскага кампазітара Аляксандра Шыдлоўскага яго песня „Колькі ў небе зор”, усе прысутныя ў зале ўсталі і разам з ансамблем спявалі. На канцэрце прысутнічала разам з мужам дачка кампазітара.

Гродзенскі мастацкі калектыў „Гарадніца” быў запрошаны на святкаванне 30-годдзя харавога гурту „Арэшкі” з Арэшкава, што ў Гайнаўскім павеце. У госці ў Арэшкава ездзілі таксама старшыня ГП БГКТ Ян Сычэўскі і сакратар Валянціна Ласкевіч.

Міхась ХМЯЛЕЎСКІ

Фота АНДРЭЯ ВРОНКІ



*Удзельнікі сплыву размаўляюць з Уладзімірам Навумюком (другі справа), першы справа — доктар Е. Самусік, яго жонка сядзіць (другая злева)*

**Найцікавейшымі былі сустрэчы з людзьмі**

# „Z panem Naumiukiem jestem w dużej przyjaźni...”

Пішучы сёлета серыю артыкулаў пра вядомага беластоцкага доктара, падарожніка і пісьменніка Ежы Самусіка, я, шчыра кажучы, крыху хвалявалася. Ці зразумеюць яго пасію чытачы „Нівы”, ці добра ацэняць яго цягу да падарожжаў і пісання кніжак тыя патэнцыяльныя і цяперашнія пацыенты аддзялення рэабілітацыі Ваяводскага шпіталя імя Янджэя Снядэцкага, якім ён кіруе, калі прачытаюць мае нарысы.

Высветлілася, што хвалявалася я дарма, а чытачы „Нівы” зусім не сядзяць у вузкім, заскарузлым свеце, пазбаўленым шырэйшага погляду на факты і з’явы. Вось да сёння д-р Ежы Самусік перапісваецца з чытачом „Нівы” Серафімам Корчак-Міхалеўскім з Варшавы, якога найбольш зацікавіў адрэзак, дзе было апісана падарожжа доктара ў Індыю. Там менавіта сутыкнуўся ён з архівам, у якім, як гаворыць легенда, захоўваюцца матэрыялы, што раскрываюць таямніцу прабывання Ісуса Хрыста ў Індыі і Непале. На жаль, доктару не ўдалося даступіцца да гэтых надзвычай цікавых матэрыялаў, бо пра Ісуса Хрыста вядома нам толькі яго дзяцінства і невялікі адрэзак часу перад смерцю.

А летам я атрымала вельмі прыемны ліст з амерыканскага Тэхаса ад Свяціслава Шабовіча, які дзеліцца са мною сваімі творчымі дасягненнямі і планамі, а заадно дадае сіл і нам, журналістам „Нівы”: „Мне вельмі прыемна чытаць вашы артыкулы ў „Ніве”. Пра доктара Ежы Самусіка я чытаў проста з захапленнем. Усё напісанае пра яго я прачытаў ад пачатку да канца”.

Значыць, падумала я, трэба пісаць. Пісаць прынамсі па меры магчымасцей і тое найважнейшае, чаго хочуць людзі, хаця надвор’е „Ніве” і некаторым журналістам не зусім спрыяе. І так я вырашыла зноў сустрэцца з доктарам Е. Самусікам і даведацца ад яго, што робіць ён цяпер, тым больш, што збіраўся ўзяць на шырэйшы варштат менавіта Беласточчыну, наш край.

О не! Не спачыў наш доктар на лаўрах. Мо неўзабаве пайду на пенсію — во дзе папішу! — гаворыць ён. Але і гэта лета было для яго працавітае. Так, як і намераўся, разам з жонкай Кацярынай узяў удзел у сплыве на байдарках па рацэ Нарве — ад мястэчка Нарвы да Тыкоціна. У апошнім этапе сплыву ўзяў удзел нават іхні дзевяцігадовы сынок Мацейка, якога бабуля падвезла самаходам да месца адпачынку перад апошнім этапам. Нічога дзіўнага, што хлапец не баяўся: тата і мама яго — не толькі лечаць людзей, але і спартсмены, тым больш, што і сам Мацейка ўжо добра плавае.

Ну, што ж, знайшоў доктар Е. Самусік і новы часопіс для сябе, у якім пачаў друкавацца. Часопіс называецца „Parki Narodowe” і выдаецца ў Варшаве. Там ён змясціў артыкул пра Нарвянскі нацыянальны парк, дырэкцыя якога знаходзіцца ў Курове, у сядзібе былога палаца („Dwór w Kurowie”).

Курова здаўна было звязана з валасным Ваневам, якое ў 1501 годзе будучы кароль Польшчы, а тады вялікі князь Літоўскі Аляксандр Ягелончык ахвяраваў будучаму віленскаму ваяводзе Мікалаю Радзівілу. Такім чынам, Ванева разам з Куровам было ўласнасцю Радзівілаў на працягу 100 гадоў. Пасля валодалі ім бельскі кашталян Геранім Сіняўскі, слуцкі князь Юрый Алелькавіч ды многія іншыя.

У часе сплыву гэтым летам доктар Е. Самусік меў магчымасць затрымацца ў Курове і пазнаёміцца з гэтай сядзібай. Нарвянскі нацыянальны парк называюць, як вядома, „польскай Амазоніяй”, бо там рэчышча падзяляецца на цэлы шэраг адгалінаванняў, якія плывуць сярод трыснягу і чароту многімі нуртамі пакуль не спалучацца ізноў у адну раку.

Для мяне найцікавейшымі былі сустрэчы з людзьмі, расказвае доктар. Асабліва заваражыла мяне сустрэча з Уладзімірам Навумюком з Канюкоў. Мы затрымаліся на яго лузе, паставілі там палаткі і пераначавалі. На другі дзень мы пайшлі да яго, у дом яго прадзеда, каб паглядзець драўляныя скульптуры Уладзіміра Навумюка.

Дом адрамантаваны і служыць яго майстэрняй і галерэяй. Зацікавілі нас не толькі рэзьбы, але і аповед гаспадара пра колішнія прафесіі, рамяство, пра тое, як Нарва калісьці была вялікай ракой, па якой арэлі сплаўлялі дрэва аж з Белавежскай пушчы ў Гданьск.

Захапіла нас і другая сустрэча — з Віктарам Літвінчуком, які ў Суражы мае прыватны археалагічны музей. Ён паказаў нам тое, што знайшлі ў зямлі ён і яго бацька, напрыклад, наканечнікі паляўнічых стрэл, якія былі знойдзены над Нарвай, гарпун з касцей звяроў для лоўлі рыбы, старажытныя рымскія манеты (праз Сураж вёў калісьці гандлёвы шлях у Літву), каштоўныя камяні (апалы, янтар, аметыст). Там жа, ля падножжа гары каралевы Боны застаўся колішні яе скарбец, у якім пазней яна паслала сваіх падданых, але ім, на жаль, нічога не ўдалося знайсці. А вось Літвінчукам намнога гадоў пазней удалося знайсці хаця некалькі каменяў.

У гэтым музеі ёсць і сучасныя рэчы, як, напрыклад, першае радыё. Убачым тут колішнія жорны, усё для лоўлі рыбы, гарбарскія сярэднявечныя прылады.

(заканчэнне ў наступным нумары)

Ада Чачуга

Фота з архіва Управы горада ў Бельску-Падляшскім



*Першая медыцынская дапамога*

# Для аховы насельніцтва ў мірны час

**У звычайны дзень непрыкметныя, выходзяць у час стыхійных няшчасцяў... Чым з’яўляецца грамадзянская абарона? Ці бельскі раён бяспечны?**

Гаворыць Януш Карыцкі, загадчык Рэферата грамадзянскіх спраў пры Управе горада ў Бельску-Падляшскім:

— Грамадзянская абарона (ГА) была да 1990 года важнай дзялянкай, але ў 1990 годзе высахлі грашовыя крыніцы і паменшала яе роля. Пакуль што, абмяжоўваемся да дзеянняў па абароне насельніцтва ў мірны час. Нядаўна навелізаваны закон пра ўсеагульны абавязак абароны Рэчы Паспалітай і выйшла распараджэнне Рады міністраў пра кампетэнцыі ўрадавых і самаўрадавых органаў. Раней было абмежаванае фінансаванне ваяводам, значыць, з дзяржаўнага бюджэту, а цяпер усё поўнасцю абапіраецца на бюджэты органаў самакіравання. І тыя задачы, якія ставіць перад намі Гарадская рада, мы рэалізуем, галоўным чынам вучэнні на прадпрыемствах і ў камандах грамадзянскай абароны непасрэдна падпарадкаваных бурмістру.

У горадзе маем самастойную роту ГА, а ў некаторых прадпрыемствах ёсць спецыялізаваныя каманды, напрыклад, у „Polbudzie” будаўнічыя ратаўнікі, у камунальным прадпрыемстве — камунальныя. Усіх іх навучаем пра магчымыя стыхійныя пагрозы, сігналы трывогі, спосабы супрацьдзеяння бедствам, напрыклад, пра забруджанне хлорам, аміякам. Знаёмім з устройствамі, якія маем у аснашчэнні гарадскога складу ГА, напр. процівагазы, вымерныя прылады, насілкі. Трымаем дзяжурствы; г.зв. пастаяннае дзяжурства бывае раз у месяц, калі мы непасрэдна звязваемся з ваяводам і староствам. Існуе сістэма асцерагання насельніцтва: у Бельску маем сем сірэн трывогі, якія можам заводзіць па радыё.

Чарговай дзялянкай з’яўляюцца планістычныя меры, якія кранаюць эвакуацыі або прыняцця насельніцтва, праверкі некаторых пагроз, напр. уцечкі аміяку на харчовых заводах. Чыгунка запэўнівае нас, што праз Бельск не праходзяць небяспечныя транспарты. Апрацаваны планы крызіснага кіравання, напрыклад, на час паводкі.

Удзельнічаем у праверачных вучэннях арганізаваных Ваяводскай управай; мы, як горад, уключаемся ў гмінныя вучэнні, бо напр. шпіталь забяспечвае ўвесь павет, прадбачваючы і запасныя шпітальныя палявыя пункты.

У гэтым годзе горад прызначыў 3 600 зл. на нашы патрэбы і гэтыя сродкі кіруем галоўным чынам на вучэнні. Большасць з іх праводзіцца навесну, калі ваявода прысылае задачы ў органы самакіравання, а іх кіраўнікі ставяць задачы сваім ячэйкам. У гэтым годзе, бадай у лістападзе, адбудуцца штабныя вучэнні, арганізаваныя старосвам. У канцы года патрабуем ад прадпрыемстваў справаздач і самі інфармуем ваяводу пра выкананне пастаўленых нам абавязкаў.

Каманды ГА ў нашым горадзе налічвалі калісь 300 чалавек, а сёння каля 100 асоб; камендантам з’яўляецца Анджэй Келкуцкі, намеснік дырэктара Прадпрыемства камунальнай гаспадаркі. Нашы ратаўнікі не выязджаюць у вонкавыя раёны стыхійных няшчасцяў, бо яны не з’яўляюцца спецыялізаваным атрадам, не маюць адпаведнага аснашчэння. І такі выезд каштуе, бо ж людзей адрываецца ад іхняй працы.

Міхал Мінцэвіч

# Заклік

*Грамадскі камітэт пабудовы Музея і асяродка беларускай культуры ў Гайнаўцы распачаў працу па стварэнні этнаграфічнай экспазіцыі. На жаль, працы рухаюцца паволі з-за недастатковай колькасці экспанатаў і грошай.*

*У сувязі з тым звяртаемся да ўсіх чытачоў газеты „Ніва" з просьбай дапамагчы ў зборы патрэбных рэчаў, прадметаў матэрыяльнай і духовай культуры беларусаў Падляшша. Апрача экспанатаў выстаўку варта папоўніць фотаздымкамі, якія паказваюць выкананне хатніх і палявых прац, фотаздымкамі, на якіх увекавечаны сямейныя і рэлігійныя святы: хрэсьбіны, вяселле, паховіны і г.д. Арыгіналы фотаздымкаў будуць вернуты ўласнікам пасля скапіравання.*

*Ахвотных перадаць экспанаты і фотаздымкі Музею просім тэлефанаваць па нумары: 682-28-89 або 682-30-16 ці непасрэдна скантактавацца з працаўнікамі Музея па адрасе: 17-200 Гайнаўка, вул. 3 Мая, 42.*

*Шчыра дзякуем ранейшым ахвяравальнікам.*

З павагаю Старшыня Камітэта Янка ХІЛІМАНЮК



Барбара Дарэвіч, старшыня Беластоцкага адзела ПТУ — другая злева

**Мы — акно на свет для беларускіх уролагаў**

# Пяты Польска-беларускі сімпозіум уролагаў

На трохдзённым сімпозіуме ў Белавежы сустрэліся уролагі — навукоўцы і практыкі з Польшчы і Беларусі. Арганізатарам быў Беластоцкі аддзел Польскага таварыства уралогіі з яго старшынёй Барбарай Дарэвіч, дацэнтам Клінікі уралогіі Дзяржаўнай клінічнай бальніцы ў Беластоку. Супрацоўнічае яна ад дзевяностых гадоў з найважнейшымі клінічнымі цэнтрамі уралогіі ў Мінску, Магілёве, Брэсце і Гродне.

— Для спецыялістаў з Беларусі наша супрацоўніцтва адкрывае акно ў свет, — кажа дацэнт Б. Дарэвіч. — Дзякуючы супрацоўніцтву з намі і нашай дапамозе маюць яны кантакт з дыягностыкай, сучасным лячэннем на заходнім узроўні. Польская уралогія, наша клініка ідзе нага ў нагу з заходнімі цэнтрамі. Дзякуючы нашым асабістым кантактам мы аформілі беларускім калегам месячныя навуковыя пабыўкі ў Беластоку. На сённяшнюю сустрэчу (наперамення сімпозіумы адбываюцца ў нас і ў іх) прыбыло 25 беларускіх уролагаў.

У трох сесіях прыняло ўдзел з дакладамі больш за сто уролагаў з Беларусі, Беластока, Быдгашчы, Лодзі, Варшавы і Любліна. Найбольшае зацікаўленне выклікалі дзве тэмы — запаленняў і рака прастаты, аднаго з найчасцейшых захворванняў у мужчын, і расстройствы ў эрэкцыі. У дакладах краналіся тэмы ранняга выкрывання (накіроўванне пацыентаў на простае даследаванне PSA — выкрыванне ракавых маркераў у крыві) і метадаў аперыравання. Другая з'ява — праблемы з эрэкцыяй — кранаюць шмат мужчын, асабліва пасля 35 года жыцця (каля 4,5 тысяч). Каля 10 працэнтаў пакутуе цалкавітай імпатэнцыяй, а 42 працэнтам мужчын трапляюцца часовыя расстройствы, якія можна лячыць.

Беластоцкая клініка прэзентавала свае дасягненні ў вылечванні імпатэнцыі. Належыць яна да вядучых цэнтраў ва ўсёй краіне.

— Больш за 65 працэнтаў нашых пацыентаў задаволены з паспяховасці нашых працэдур, — заўважае дацэнт Б. Дарэвіч.

У Клініцы уралогіі ёсць свае дасягенні ў аперыраванні рознага тыпу ракаў і ракападобных змен. Напрыклад, нядаўна выканана была першая лапараскопная аперацыя выняцця нарасці на наднырачніку. Пра свае дасягненні ў гэтага тыпу аперацыях (у нутры арганізма, з дапамогай камп'ютэра) гаварылі вядучыя уролагі з Быдгашчы і Лодзі. Такім метадам можна даставаць з цела пацыента не толькі ракавыя нарасці, але і мачавыя камяні, нарасці на нырках, ліквідаваць звужанне тазікава-мачавога спалучэння і ліквідаваць іншыя уралагічныя захворванні.

Самыя паказы ў час дакладаў былі вельмі добра падрыхтаваны, з выкарыстаннем камп'ютэрнай тэхнікі — на экране паказваўся тэкст даклада на польскай ці англійскай мове, дыяграмы, працэнтныя паказальнікі, нават фільмавыя фрагменты ды стоп-кадры аперацый. На гэта звярнула ўвагу прафесар Людміла Нечыпарэнка з Гродна. Было пастаўлена пытанне, ці афіцыйнай мовай дакладаў можа быць, апрача польскай і рускай, таксама англійская. На маю думку, мабыць, яшчэ і латынь, калі браць пад увагу мёртвыя мовы. Сімпозіум жа ж — польска-беларускі.

Міра ЛУКША

# Аб чым думалі?

Аб неразважлівасці чыгуначных чыноўнікаў неаднойчы пісала „Ніва". Сёння пакажу чарговы прыклад.

Ад 1 кастрычніка Прадпрыемства перавозу пасажыраў у Беластоку ўвяло курсіраванне аўтобуса на лініі Чаромха — Беласток. Аўтобус з Чаромхі ад'язджае ў 19[14] і вяртаецца з Беластока наступнай раніцай у 8[40]. Разумею, што дырэктар Галіна Кужына кіравалася эканамічнымі прынцыпамі, паколькі па іхніх падліках нямнога пасажыраў едзе ў гэты час. А ці чыгуначныя чыноўнікі падумалі аб падарожных? На вышэйзгаданай лініі абавязвае абмежаваная хуткасць 30 км/гадз. Падарожныя вымушаны цялепацца каля трох гадзін. Вядома таксама, што ў рэйкавых аўтобусах няма туалета. Дзе тады афармляць фізіялагічныя патрэбы? Дабрадзейнасцю чыгункі карыстаюцца дарослыя і дзеці, а неаднойчы і хворыя людзі, якія шторах вымушаны заліцці ў гэты кутачак. Запытаў я аднаго кандуктара, як паступаць у такіх выпадках. Чыгуначнік адказаў: „Машыніст абавязаны спыніць аўтобус"... — А далей што? — пытаю. „У кусты трэба шпарыць", — жартам кідае гэты. На маю думку, справа больш сур'ёзная і з гэтага нельга жартаваць. Таму спадзяюся, што рашэнне неўзабаве будзе адменена, паколькі набліжаецца зіма і „выпрацаваныя" рэйкавыя аўтобусы не апраўдаюцца ў час перавозу на шляху Чаромха — Беласток.

Уладзімір СІДАРУК

# Двухлітарная крыжаванка



**Гарызантальна:** 1. вучоба, навучанне, 3. усходні платан, 5. расліна сямейства ружаквветных з салодкімі чырвонымі ягадамі, 7. напр. Нёман, 9. паніжэнне ўзроўню, 10. прыстасаванне для аховы органаў дыхання ад атрутных газаў, 11. статуй для язычніцкага пакланення, 12. сталіца Мальдываў, 14. тата, 16. палёгка ў абавязках, 17. выкапнёвы матэрыял або разнавіднасць свойскіх жывёл.

**Вертыкальна:** 1. прырода, 2. левы прыток Волгі, 3. рака ў Забайкаллі, адзін з вытокаў Віціма, 4. адсутнасць адзінства, нязгода, 6. крывадушная хвальба, падхалімаж, 8. польскае воінскае званне малодшага камандзіра, 9. сутаргавае скарачэнне мышцаў, 11. горад у Маўрытаніі каля граніцы з Заходняй Сахарай, 13. пустазелле сямейства лебядовых, 14. порт у мацерыковай частцы Экватарыяльнай Гвінеі, 15. 60 штук.

(Ш)

Рашэнне крыжаванкі складуць літары з пазначаных курсівам палёў. Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

**Адказ на крыжаванку з 36 нумара**

**Гарызантальна:** упор, манах, эбаніт, удой, золак, каліва, капібара, каган, камандор, марцыпан, замак, „Даместас", балота, скетч, коўш, бурнос, амёба, Ізар.

**Вертыкальна:** калода, макака, падліўка, рэйка, масла, бітва, кандыдат, Арканзас, Комі, герц, Эдэм, крук, анісаўка, аскома, Ахтуба, капут, дойна, максі.

Рашэнне: **Паміраe той, хто не пакідае добрых успамінаў**.

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Лукашу Пацэвічу** з Беластока і **Мікалаю Сазановічу** з Навін-Вялікіх.

# Прыбіранне свету

20 верасня было днём прыбірання свету. З гэтай нагоды вучні Гімназіі і Пачатковай школы ў Чаромсе актыўна ўдзельнічалі ў акцыі. Прыбіраннем была ахоплена тэрыторыя Каганкі, пасёлка Новы і чыгуначнай станцыі. З Гімназіі ўдзельнічаў 61 вучань, якія сабралі каля двух тон смецця, а з Пачатковай школы — 90 вучняў. Гэтыя сабралі сто семдзесят два мяшкі паўторнай сыравіны.

Школьнікам дапамагалі паліцыянты і рабочыя Бельскага надлясніцтва. (ус)


**Ніва** ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

**Выдавец**: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
**Старшыня**: Яўген Мірановіч.
**Адрас рэдакцыі:** 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
**Тэл./факс:** (0 10xx 85) 743 50 22.
**Internet**: *http://republika.pl/niva_bielastok/*
**E-mail**: *niva_bielastok@poczta.onet.pl* альбо: *niva_bielastok@skrzynka.pl*

*Zrealizowano przy pomocy finansowej Ministerstwa Kultury.*
**Галоўны рэдактар:** Віталь Луба.
**Сакратар рэдакцыі:** Аляксандр Максімюк.
**Рэдактар „Зоркі":** Ганна Кандрацюк-Свярубская.
**Публіцысты:** Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Ада Чачуга, Паўліна Шафран.
**Канцылярыя:** Галіна Рамашка.

**Камп'ютэрны набор:** Яўгенія Палоцкая, Марыя Федарук.
**Друкарня**: „Orthdruk", ul. Składowa 9, Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
**Prenumerata:** 1. Termin wpłat na prenumeratę na I kwartał 2003 r. upływa 5 grudnia 2002 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.
2. Cena prenumeraty na I kwartał 2003 r. wynosi 26,00 zł.
3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 115,00; pocztą lotniczą Europa — 127,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 153,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 12401053-40060347-2700-401112-005.
4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,40 zł, a kwartalnie — 44,20 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 4,70 (kwartalnie — 61,10), pocztą priorytetową: Europa — 5,90 (76,70), Ameryka Płn., Afryka — 6,60 (85,80), Ameryka Płd., Środk., Azja — 7,40 (96,20), Australia — 9,60 (124,80). Wpłaty przyjmuje Rada Programowa Tygodnika „Niwa", Białystok, ul. Zamenhofa 27, nr konta PBK S.A., I Oddział Białystok, 11101154-401150015504.

# МЫ Ў СЯБЕ







*Люблю наш край, старонку гэту...*

## БЕЛАРУСКІ ВЫБАРЧЫ КАМІТЭТ

**Kandydaci Białoruskiego Komitetu Wyborczego w wyborach samorządowych 27 października 2002 r. do Rady Miejskiej w Białymstoku**

**Okręg Nr 1** (osiedla: Śródmieście, Liniarskiego, Przydworcowe, Kopernika, Tysiąclecia, Skłodowskiej, Piaski, Waryńskiego, Bema):

1) Lidia Smyk, 2) Oleg Łatyszonek, 3) Aleksander Maksymiuk, 4) Jerzy Mazuruk, 5) Mirosław Kopciński, 6) Joanna Tyszko, 7) Paweł Stachwiuk.

**Okręg Nr 2** (osiedla: Sienkiewicza, Białostoczek, Pietrasze, Wysockiego-Zgoda, Jaroszówka, Wyżyny, Bagnówka, Pieczurki, Wygoda, Traugutta):

1) Jerzy Chmielewski, 2) Jerzy Szulski, 3) Stefan Bazyluk, 4) Tamara Dorota Łukasiewicz, 5) Dariusz Samsonik, 6) Eugenia Spalik, 7) Iwona Hulko.

**Okręg Nr 3** (osiedla: Bojary, Kraszewskiego, Chopina, Piasta I, Piasta II, Skorupy, Nowe, Dojlidy, Przemysłowe, Mickiewicza):

1) Grażyna Gresiuk, 2) Antoni Mironowicz, 3) Anna Gryciuk, 4) Michał Stelmaszuk, 5) Aleksander Suszczenia, 6) Marek Anchimiuk.

**Okręg Nr 4** (osiedla: Nowe Miasto, Ścianka, Bażantarnia, Starosielce, Zielone Wzgórza, Słoneczny Stok, Leśna Dolina, Marczuk, Młodych):

1) Władysław Pietruk, 2) Piotr Chomik, 3) Alina Wawrzeniuk, 4) Ludmiła Utrutko, 5) Mikołaj Walicki, 6) Witalis Łuba, 7) Bożenna Bałdowska, 8) Andrzej Żamojda, 9) Dariusz Małaszewski.

**Okręg Nr 5** (osiedla: Tuwima, Przyjaźń, Sady Antoniukowskie, Dziesięciny I, Fasty, Bacieczki, Wysoki Stoczek, Bacieczki II, Dziesięciny II, sołectwo Zawady):

1) Małgorzata Borys, 2) Leon Sawczuk, 3) Jarosław Timofiejuk, 4) Aleksander Kazimierczyk, 5) Halina Gryk, 6) Włodzimierz Sewastianiuk, 7) Krzysztof Sieśkiewicz.

**Do Sejmiku Województwa Podlaskiego**

**Okręg Nr 1** (miasto Białystok):

1) Sokrat Janowicz, 2) Mikołaj Kuryło, 3) Mirosława Łuksza, 4) Piotr Giermaniuk, 5) Arnold Toczyski, 6) Maciej Juliusz Chołodowski, 7) Andrzej Łukaszewicz, 8) Piotr Prokopczyk.

**Okręg Nr 4** (powiaty: zambrowski, wysokomazowiecki, siemiatycki, bielski):

1) Jan Czykwin, 2) Piotr Juszczuk, 3) Luiza Ewa Bałdowska, 4) Tadeusz Supiński, 5) Anna Szerszeń.

**Okręg Nr 5** (powiaty: moniecki, sokólski, hajnowski, białostocki):

1) Eugeniusz Wappa, 2) Włodzimierz Łukoszyk, 3) Jan Topolański, 4) Mirosław Pac, 5) Grażyna Pawluczuk, 6) Józef Jodczyk, 7) Ewa Jolanta Sawicka, 8) Mariusz Niczyporuk.

**Kandydaci Koalicji Bielskiej do Rady Miasta Bielska Podlaskiego**

**Okręg Nr 1**:

1) Sławomir Iwaniuk, 2) Jan Kondratiuk, 3) Tamara Rusaczyk, 4) Jerzy Bajena, 5) Irena Grygoruk, 6) Jolanta Sorokin-Fiedoruk, 7) Andrzej Krzywiec, 8) Aleksander Naumczyk, 9) Sławomir Mojsik, 10) Mikołaj Szachowicz, 11) Krzysztof Gliwa, 12) Jerzy Zabrocki.

**Okręg Nr 2**:

1) Zenaida Nowicka, 2) Mirosław Jakubiuk, 3) Maria Ryżyk, 4) Walenty Łapciew, 5) Bazyli Niedźwiecki, 6) Helena Burzyńska, 7) Ireneusz Krasowski, 8) Alina Dąbrowska, 9) Andrzej Kordiukiewicz, 10) Włodzimierz Polanowski.

**Okręg Nr 3**:

1) Aleksander Bożko, 2) Mikołaj Chrol, 3) Mikołaj Budka, 4) Anatol Puławski, 5) Jan Grygoruk, 6) Anna Korowaj, 7) Piotr Czerniakiewicz, 8) Bogdan Simonienko, 9) Piotr Aleksiuk, 10) Jan Sulima.

**Okręg Nr 4**:

1) Piotr Kondratiuk, 2) Andrzej Wyszkowski, 3) Roman Jakubiuk, 4) Włodzimierz Sac, 5) Wiktor Wiszniewski, 6) Dariusz Fionik, 7) Andrzej Szarko, 8) Mikołaj Martyniuk, 9) Jarosław Paniutycz, 10) Jerzy Łukaszuk.

**Kandydaci Koalicji Bielskiej do Rady Powiatu Bielsk Podlaski**

**Okręg Nr 1** (miasto Bielsk Podlaski):

1) Bazyli Leszczyński, 2) Sergiusz Łukaszuk, 3) Jan Kiryziuk, 4) Helena Buszko, 5) Mikołaj Wiazowski, 6) Irena Zinkiewicz, 7) Grzegorz Sulima, 8) Stefan Wyrkowski, 9) Eugeniusz Bedeniczuk, 10) Włodzimierz Gliwa, 11) Elżbieta Nielipińska, 12) Janusz Werszko, 13) Jerzy Sosniuk, 14) Włodzimierz Tkaczuk, 15) Mirosław Burzyński, 16) Jerzy Czykwin.

**Okręg Nr 2** (gminy: Boćki, Orla, Brańsk, Rudka, miasto Brańsk):

1) Eugenia Wasiluk, 2) Eugeniusz Tymoszewicz, 3) Mirosław Bałło, 4) Piotr Selwesiuk, 5) Helena Pasiecznik, 6) Walentyna Marcinowicz, 7) Teodor Żurawl, 8) Mikołaj Szkoda, 9) Zenobiusz Gul.

**Okręg Nr 3** (gminy: Bielsk Podlaski i Wyszki):

1) Piotr Bożko, 2) Walenty Gliwa, 3) Jan Roszczenko, 4) Jerzy Żmieńko, 5) Anatoliusz Siemieniuk, 6) Włodzimierz Gawryluk, 7) Marek Mojsik.

**Kandydaci Białorusko-Ludowego Komitetu Wyborczego do Rady Miasta w Hajnówce**

**Okręg Nr 1**:

1) Eugeniusz Saczko, 2) Michał Bajko, 3) Mirosław Mordań, 4) Mikołaj Jewdosiuk, 5) Piotr Markiewicz, 6) Wiktor Dzik, 7) Wiktor Golonko, 8) Jan Karczewski, 9) Witalis Kicel, 10) Lidia Juszczuk, 11) Aleksander Wołczuk.

**Okręg Nr 2**:

1) Eugeniusz Jańczuk, 2) Bazyli Iwaniuk, 3) Jan Pietruczuk, 4) Piotr Karpiuk, 5) Sergiusz Awksientjuk, 6) Olga Sienkiewicz, 7) Janusz Puch, 8) Anatol Owsieniuk, 9) Ewa Sadowska-Czmak, 10) Mikołaj Koszel, 11) Taisa Kerschbaum, 12) Grzegorz Szwarc, 13) Anna Charkiewicz, 14) Leon Kondraciuk.

**Okręg Nr 3**:

1) Mikołaj Golonko, 2) Jan Lemiesz, 3) Anatol Filipczuk, 4) Jan Gromotowicz, 5) Walentyna Ostaszewska, 6) Michał Juszczuk, 7) Luba Bujnowska, 8) Jan Kuptel, 9) Aleksy Borowik, 10) Olga Osipiuk, 11) Piotr Czerniakiewicz.

**Kandydaci Białorusko-Ludowego Komitetu Wyborczego do Rady Powiatu Hajnówka**

**Okręg Nr 1**:

1) Michał Androsiuk, 2) Piotr Sakowicz, 3) Michał Gołub, 4) Anatol Łapiński, 5) Nela Szczuka, 6) Sławomir Czykwin, 7) Nina Bura, 8) Bazyl Stepaniuk, 9) Anatol Kalinowski, 10) Paweł Iwacik, 11) Jerzy Jańczuk, 12) Jan Kozak, 13) Włodzimierz Szeszko, 14) Leon Topolewski, 15) Michał Piasecki.

**Okręg Nr 2**:

1) Mikołaj Janowski, 2) Mirosław Romaniuk, 3) Eugeniusz Kowalczuk, 4) Andrzej Józef Nowak, 5) Roman Wołkowycki, 6) Jan Adamczuk.

**Okręg Nr 3**:

1) Jarosław Gerasimiuk, 2) Nina Oksentiuk, 3) Michał Kuryło, 4) Sławomir Kulik, 5) Jerzy Nazaruk, 6) Maria Leoniuk.

**Okręg Nr 4**:

1) Eugeniusz Abramiuk, 2) Jarosław Charkiewicz, 3) Tamara Moroz, 4) Jan Naumczyk, 5) Aleksander Stańko, 6) Jarosław Stocki.

ISSN 0546-1960